

КАЛЯДУЕМ СА ЗВЯЗДОЙ? А ЯК ЖА!

11

COVID-19: ЯК АДНАВІЦЦА ПАСЛЯ ХВАРОБЫ

13



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

15 СНЕЖНЯ 2021 г. СЕРАДА № 242 (29611)

## КОРАТКА

• На Беларускай чыгунцы дадзены старт акцыі «Дзеці і бяспека».

• Першая ў Беларусі арт-галерэя творчасці інвалідаў з дамоў-інтэрнатаў адкрылася ў Мінску.

• Дзяржлесахова напярэдадні навагодніх свят пяройдзе на ўзмоцнены рэжым работы.

• Нацбанк выпусціў у абарачэнне новыя памятныя манеты.



• Больш за 600 працоўных месцаў прапануюць наймальнікі Мінска на кірмашы вакансій 16 снежня.

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Сяргей ЖАРНАСЕК, намеснік начальніка Аператыўна-аналітычнага цэнтра пры Прэзідэнце:**

*«З укараненнем лічбавых тэхналогій востра стаіць пытанне аб гарантаванні бяспекі інфармацыі. Апошнім часам пачасціліся выпадкі кіберінцыдэнтаў у інфармацыйных сістэмах дзяржаўных органаў і арганізацый. У большай ступені яны звязаны з невыкананнем кіраўнікамі патрабаванняў заканадаўства аб інфармацыі, інфарматызацыі і ахове інфармацыі. Кібермахляры карыстаюцца адсутнасцю сістэмы абароны, выкарыстаннем састарэлага абсталявання і праграмнага забеспячэння, якое не падтрымліваецца вытворцам, яны атрымліваюць несанкцыянаваны доступ і парушаюць работу ўсёй сістэмы, чым могуць нанесці страты, у тым ліку і прадпрыемствам».*

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

# «Трэба даваць дарогу маладым, але не забываць пра вопытныя кадры»

### Прэзідэнт наведаў Магілёўскую вобласць, прадставіў актыву новага губернатара

**Аляксандр Лукашэнка прыняў удзел у нарадзе з актывам рэгіёна ў Магілёўскім аблвыканкаме. Падставай для чарговай сустрэчы стала змена губернатара і прадстаўленне новага старшыні аблвыканкама Анатоля Ісачанкі яго будучым падначаленым. Афіцыйнае мерапрыемства адразу пайшло незапланаваным парадкам. Кіраўнік краіны сказаў, што плануе з актывам вобласці пагаварыць «пра жыццё, пра тое, чым дыхае Магілёўшчына». І замест свайго выступлення найперш даў слова начальніку ўпраўлення КДБ па Магілёўскай вобласці.**

Ігар Паўлюшчанка адзначыў, што сітуацыя ў рэгіёне стабільная і кантралюецца. Начальнік упраўлення Камітэта дзяржаўнай бяспекі коратка далажыў аб сацыяльна-палітычнай абстаноўцы, што складваецца ў вобласці, аб рэагаванні на новыя выклікі і пагрозы бяспецы.

Сваё бачанне сітуацыі таксама агучыў начальнік абласнога ўпраўлення ўнутраных спраў Ігар Шчарбачэня. Паводле яго слоў, намаганні міліцыі цяпер накіраваны на спыненне дэструктыўнай дзейнасці, устанаўленне асоб, якія маюць дачыненне да экстрэмісцкай дзейнасці. «Праводзім актыўную работу, каб і ў далейшым не дапусціць тэрарыстычных праяў», — заявіў начальнік УУС.

СТАР. 2

# У ДОБРЫ ШЛЯХ, «НАШЫ ДЗЕЦІ»!

### Па ўсёй краіне пачаліся ўрачыстыя мерапрыемствы штогадовай дабрачыннай акцыі

**Марафон добрых спраў стартаваў учора па ўсёй краіне. Мяркуецца, што сёлета ў святочных навагодніх і калядных мерапрыемствах з нязменнымі падарункамі і сюрпрызамі возьме ўдзел каля 200 тысяч маленькіх беларусаў. Усяго ж мерапрыемствамі рэспубліканскай дабрачыннай акцыі будзе ахоплена каля мільёна дзяцей. Урачыстае адкрыццё акцыі «Нашы дзеці» адбылося ў Нацыянальным цэнтры мастацкай творчасці дзяцей і моладзі — старт дабрачыннай кампаніі даў віцэ-прэм'ер урада Ігар ПЕТРЫШЭНКА. Нагадаем, што асабліваю сёлета стане тое, што свой унёсак у скарбонку добрых спраў можа зрабіць кожны, пералічыўшы любую суму на дабрачынны рахунак Беларускага дзіцячага фонду. Сродкі пойдуць на дапамогу дзецям, якія маюць патрэбу ў дзяржаўнай падтрымцы.**

СТАР. 3



Фота БелТА.

# ШЛЯХАМ «ЖАЛЕЗНАГА БРАТЭРСТВА»

### Як развіваецца стратэгічнае ўзаемадзеянне паміж Беларуссю і Кітаем?



**Беларусь і Кітай насамрэч з'яўляюцца ўсёабдымнымі стратэгічнымі партнёрамі. Аб гэтым заявіў афіцыйны прадстаўнік МЗС КНР Ван Вэньбінь, каментуючы найбуйнейшаму выданню Паднябеснай і шматгадоваму партнёру «Звязды» газеце «Жэньмінь жыбаа» Дырэктыву Прэзідэнта Беларусі № 9 «Аб развіцці двухбаковых адносін Рэспублікі Беларусь з Кітаем». Як заўважыў дыпламат, пад стратэгічным кіраўніцтвам лідараў дзвюх краін традыцыйнае сяброўства ўмацоўваецца з кожным днём, няўхільна развіваецца супрацоўніцтва ў розных галінах, прадукцыйным з'яўляецца ўзаемадзеянне па пытаннях міжнароднага парадку дня. «Кітай гатовы і надалей рухацца насустрач Беларусі, умацоўваць узаемны палітычны давер на высокім узроўні, паглыбляць усебаковыя адносіны і супрацоўніцтва паміж дзвюма краінамі і садзейнічаць пашырэнню ўсёабдымнага стратэгічнага партнёрства», — падкрэсліў афіцыйны прадстаўнік МЗС КНР. Як развіваецца ўзаемадзеянне паміж Беларуссю і Кітаем?**

СТАР. 8

ISSN 1990 — 763X

21242>

Кожны дзень – са «Звяздой»!

Усім, хто падпісаўся на І квартал або І паўгоддзе 2022 года, — у падарунак чатыры календары — маляўнічы насценны, рэлігійны, народны і месяцавы



# «Трэба даваць дарогу маладым, але не забываць пра вопытныя кадры»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Аляксандр Лукашэнка пацікавіўся, які раён у Магілёўскай вобласці непакоіць праваахоўнікаў найперш з пункту гледжання злачыннасці. Як адзначыў Ігар Шчарбачэня, асноўную ўвагу міліцыя ўдзяляе Магілёву і Бабруйскаму раёну.

Кіраўнік дзяржавы звярнуў асаблівую ўвагу на праблему падзяжу жывёлы і нагадаў, што ставіў адпаведныя задачы ў гэтай сферы і праваахоўнікам пасля таго, як на прадпрыемствах былі выяўлены злачынныя схемы. «Я неяк сказаў, што без міліцыі мы парадку не навядзём. Калі вы не падключыцеся, не паставіце тут усіх на месца лайдакоў і зладзеяў, нягледзячы на асобы і званні, толку не будзе», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Наступнае пытанне — пра эпідэміялагічную сітуацыю на Магілёўшчыне да намесніка старшыні Магілёўскага аблвыканкама Валерыя Малашкі. Той расказаў, што інтэнсіўнасць захваральнасці на ковід у вобласці зніжаецца, больш непакоіць медыкаў сітуацыя з ростам сезоннага грыпу. На яго думку, сітуацыя з ковідам нармалізавалася дзякуючы сур'ёзнай рабоце з насельніцтвам у частцы заахвання мер прафілактыкі. Ды і 50 працэнтаў жыхароў рэгіёна ўжо прышчапілася першым кампанентам вакцыны.

«Трэба ісці сваім шляхам, разумеючы, што адбываецца ў свеце, узважваючы сітуацыю, у якой жыве наша краіна. Як паказаў час, своечасова ўвёўшы меры прафілактыкі, забяспечыўшы медыцынскія ўстановы неабходным абсталяваннем, навучыўшы кадры, мы гэту бітву выйгралі», — заявіў намеснік старшыні аблвыканкама.

«Так, дарога нам абышоўся гэты ковід. У тым плане, што насельніцтва запалохалі, асабліва ў першую хвалю. Цяжка ісці па асобку, калі на цябе ўсе шышкі валяцца», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Кіраўнік дзяржавы падрабязна распытаў гендырэктара прадпрыемства «Магілёўхімвалакно» Пятра Рудніка аб стане спраў на вытворчасці: «Магілёўхімвалакно» хутчэй жывы ці мёртвы?» — «Мае работнікі гавораць: ажыў», — сказаў у адказ кіраўнік завода. Прадпрыемства значна нарасціла аб'ёмы вытворчасці, працуе рэнтабельна, атрымліваючы прыбытак.

Для далейшага развіцця патрэбна мадэрнізацыя вытворчасці, падкрэсліў Пётр Руднік. Сярод актуальных для прадпрыемства пытанняў ён таксама назваў кошт энергарэсурсаў.

Аляксандр Лукашэнка расказаў і аб інвестыцыйнай прывабнасці Магілёўскай вобласці, заўважыўшы, што укладваць грошы ёсць куды: вобласць мае дастатковы інвестыцыйны патэнцыял.

«У Магілёўскай вобласці больш за 240 перспектыўных для распрацоўкі радовішчаў карысных выкапняў. Сёння ўсё гэта карыстаецца вялікім попытам», — сказаў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка ў час прадстаўлення новага старшыні Магілёўскага аблвыканкама Анатоля Ісачанкі падзякаваў за працу былому губернатару Леаніду Зайцу. «Да яго работы ў мяне няма вялікіх прэтэнзій. Ён праявіў сябе вопытным, умелым і патрабавальным кіраўніком», — канстатаваў кіраўнік краіны.

Прэзідэнт асабліва адзначыў, што заўсёды ў размовах Леанід Заяц называў Магілёўскую вобласць сваёй. І гэта азначае, што ён сапраўды ўспрымаў яе як родную.

Аляксандр Лукашэнка заўважыў, што фарміраванне дзяздольнага кадравага патэнцыялу — гэта першае, над чым давядзецца працаваць новаму губернатару. Пры гэтым Прэзідэнт падкрэсліў, што ні ў якім разе нельга сячы з-за пляча. «Заўсёды людзям трэба даваць шанц, — падкрэсліў ён. — Трэба даваць дарогу маладым, але не забываць пра вопытныя кадры».

Сёння ў тым жа фармаце Прэзідэнт будзе працаваць у Віцебску.

**Марыя ДАДАЛКА.**

## ГОДНЫ ВЫБАР

**Згодна з працэдурай, зацвердзіць кандыдатуру Анатоля Ісачанкі павінны і члены абласнога Савета дэпутатаў. Таму напярэдадні нарады з кіраўніком краіны адбылася пазачарговая сесія рэгіянальнай дэпутацкай супольнасці.**

Акрамя дэпутатаў, на сустрэчы прысутнічалі мясцовыя парламентарыі, кіраўнікі падраздзяленняў аблвыканкама, старшыні гарадскіх, раённых Саветаў дэпутатаў і райвыканкамаў, кіраўнікі прадпрыемстваў. Усяго амаль 400 чалавек.

Прадставіў Анатоля Ісачанку актыву Магілёўшчыны кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Ігар Сергеенка. Як ён адзначыў: прафесійнае сталенне Анатоля Ісачанкі як кіраўніка адбылося на Магілёўшчыне. Ад старшага інжынера калгаса ён падняўся па кар'ернай лесвіцы да старшыні Магілёўскага абласнога Савета дэпутатаў.

Па словах Ігара Сергеенкі, кіраўніцкі стыль, дзяржаўны падыход да справы, адказнасць і прынцыповасць Анатоля Ісачанкі сталі падставай для назначэння яго ў 2016 годзе памочнікам Прэзідэнта па Мінскай вобласці, а пасля і кіраўніком сталічнага рэгіёна. На гэтай пасадзе ён асаблівую ўвагу ўдзяляў сацыяльна-эканамічнаму развіццю мясцовасцяў і прадпрыемстваў, сустрэчам з насельніцтвам. Пасля парламенцкіх выбараў Анатоль Ісачанка заняў пасаду намесніка старшыні Савета Рэспублікі.

«Зыходзячы з асабістых, прафесійных якасцяў, вопыту кіраўніцкай дзейнасці, было прынята рашэнне аб назначэнні Анатоля Міхайлавіча старшынёй Магілёўскага аблвыканкама. Гэта годны выбар для Магілёўскай вобласці. Анатоль Міхайлавіч — падрыхтаваны кіраўнік з сур'ёзным вопытам работы, з уважлівым, чулым стаўленнем да турбот простых грамадзян», — сказаў кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта.

Але асабліва Ігар Сергеенка адзначыў уменне будучага кіраўніка рэгіёна знаходзіць эфектыўныя шляхі выканання задач і браць на сябе адказнасць за прынятыя рашэнні.

Пасля кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта добрыя словы пра кандыдата гаварылі яшчэ некалькі прадстаўнікоў актыву. Але ўсе выступоўцы не забываліся падзякаваць былому старшыні Магілёўскага аблвыканкама Леаніду Зайцу. Яго ў панядзелак Прэзідэнт назначыў членам Савета Рэспублікі. Самым значным пацвярджэннем павагі і самаадданай працы Леаніда Зайца на былой пазіцыі сталі шматразовыя гучныя авацыі залы ў яго адрас.

Леанід Заяц падчас сесіі таксама падняўся да трыбуны і адзначыў годны выбар Прэзідэнта на пасаду пераемніка. Ён падкрэсліў, што работа з Анатолем Ісачанкам — асаблівы, яскравы вопыт для кожнага супрацоўніка. Падзякаваў Леанід Заяц і за падтрымку на былой пасадзе.

Парламенцкі дзённік

# САЦЫЯЛЬНАЯ НАКІРАВАНАСЦЬ І ГІСТАРЫЧНАЯ СПРАВЯДЛІВАСЦЬ

## Дэпутаты прынялі ў першым чытанні рэспубліканскі бюджэт на будучы год, а таксама паставілі кропку ў законапраекце «Аб генацыдзе беларускага народа»

**Акрамя таго, на пасяджэнні шостай сесіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу, якое ўчора адбылося ў Авальнай зале, у двух чытаннях быў прыняты законапраект аб бюджэце пазабюджэтнага фонду сацыяльнай абароны насельніцтва, у першым чытанні — законапраект па пытаннях падаткаабкладання. Таксама дэпутаты падчас другога чытання прынялі законапраекты аб дзяржаўных узнагародах Беларусі і аб свабодных эканамічных зонах.**

**Старшыня Пастаяннай камісіі па бюджэце і фінансах Людміла НІЖЭВІЧ** падкрэсліла, што пры фарміраванні бюджэту дэталёва вывучалі ўплыў на яго знешняга эканамічнага ціску. «Падыходы былі наступныя. Калі разглядаліся пытанні, ці дастаткова будзе рэсурснай базы для планавання бюджэту, прынялі інерцыйны план развіцця эканомікі з тэмпам росту 100,7 працэнта», — адзначыла дэпутат. Па яе словах, захаваюцца сістэмныя меры падтрымкі рэальнага сектара эканомікі, а таксама будуць кропкава падтрымлівацца галіны, на якія найбольш уздзейнічае знешні ціск і эпідсітуацыя.

— Працягнецца павышэнне заробкаў бюджэтнікаў, — дадала Людміла Ніжэвіч. — У наступным годзе суадносіны заробку ад сярэдняга па краіне для работнікаў аховы здароўя складуць 150 %, адукацыі — 80 %. Мы ідзём паэтапна. Для гэтых мэт таксама ў рэспубліканскім бюджэце прадугледжана стварэнне рэзервовага фонду ў аб'ёме 900 мільёнаў рублёў.

Дэпутаты сцвярджаюць, што бюджэт захавае сваю поўную сацыяльную накіраванасць. З выдзеленага на медыцыну фінансавання 40 % пойдзе на далейшае развіццё амбулаторнай службы, уключаючы хуткую медыцынскую дапамогу. **Член Пастаяннай камісіі па ахове здароўя, фізічнай культуры, сямейнай і маладзёжнай палітыцы Святлана АДЗІНЦОВА** падкрэсліла, што кожны, хто звяртаецца па першасную медпамогу, атрымлівае і будзе атрымліваць яе якасна. Дэпутат акцэнтавала ўвагу, што недахопы бюджэту ніякім чынам не адаб'юцца на аказанні медпамогі — фарміруецца рэзервовы фонд, і пры неабходнасці сродкі з яго будуць паступаць на медыцыну.

**Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па бюджэце і фінансах Юлія МУРЫНА** расказала пра фарміраванне бюджэту дзяржаўнага пазабюджэтнага фонду сацыяльнай абароны насельніцтва на 2022 год. Адпаведны законапраект прыняты ў двух чытаннях. Даходы бюджэту дзяржаўнага пазабюджэтнага фонду сацыяльнай абароны насельніцтва сфарміраваны ў суме 21,4 мільярда рублёў з тэмпам росту 109,5 %, 90 % яго прыбытку — гэта абавязковыя страхавыя ўзносы. Расходы бюджэту фонду разлічаны ў суме 21,1 мільярда рублёў з тэмпам росту 109,6 %.

— Як і ў мінулыя гады, больш чым 76 працэнтаў сродкаў бюджэту фонду будзе закладзена на пенсіённае забеспячэнне, — паведаміла дэпутат. — Плануецца, што ў 2022 годзе з улікам павышэння працоўных пенсій штомесячны памер пенсій па ўзросце для непрацаздольнага пенсіянера складзе 581 рубель. На фінансаванне дапамогі будзе накіравана 4,7 мільярда рублёў (каля 22 працэнтаў ад расходу бюджэту фонду). У цэлым бюджэт фонду на 2022 год сфарміраваны з прафіцытам.

У двух чытаннях дэпутаты ніжняй палаты парламента прынялі законапраект «Аб генацыдзе беларускага народа». Ён унесены дэпутатам Ліліяй Ананіч і ўключае пяць артыкулаў. Законапраектам прызнаецца факт генацыду беларускага народа ў часы Вялікай Айчыннай вайны і пасляваенны перыяд, уводзіцца крымінальная адказнасць за публічнае адмаўленне генацыду. Генпракуратура працягне работу па выкрыцці новых фактаў, якія пацвярджаюць злачынствы акупантаў і іх памагатых. Таксама законам прадугледжаны крокі па далейшым увекавечванні памяці аб ахвярах генацыду і прызнанні факта злачынства на міжнародным узроўні.

— Прыняцце законапраекта аб генацыдзе беларускага народа мае важнае палітычнае значэнне, — заўважыў **Старшыня Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА.** — Прыняццем гэтага законапраекта мы асуджаем найвялікшае злачынства нацысцкай Германіі, яе памагатых, якое было здзейснена ў гісторыі чалавецтва. Гэты закон будзе з'яўляцца адпраўной кропкай у прызнанні генацыду беларускага народа на міжнароднай арэне. У гады Вялікай Айчыннай вайны фактычна загінула 60 мільёнаў чалавек, з іх каля 30 мільёнаў — гэта грамадзяне Савецкага Саюза. Загінуў кожны трэці жыхар Беларусі.

Як адзначыла **намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па правах чалавека, нацыянальных адносінах і сродках масавай інфармацыі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Лілія АНАНІЧ**, памяць аб ахвярах нацызму для нашага народа святая. «Беражлівае стаўленне да яе стала часткай нацыянальнай ідэі, — заявіла парламентарый. — Менавіта гэтая пазіцыя ляжыць у аснове законапраекта «Аб генацыдзе беларускага народа». Праз 80 гадоў пасля пачатку самай кровапралітнай вайны, прайшоўшы праз неймаверныя пакуты ваеннага ліхалецця і пасляваеннага аднаўлення, падвяргаючыся і ў цяперашні час знешняй гібрыднай агрэсіі, мы маем права і павінны даць справядлівую ацэнку злачынствам нацыстаў і іх памагатых на беларускай зямлі ў гады Вялікай Айчыннай вайны і ў пасляваенны перыяд, тым самым ад імя беларускага народа папярэдзіць аб немінучым пакаранні за злачынныя замахі. Дадзены законапраект заклікаы стаць палітычным, юрыдычным і маральным актам, накіраваным на абарону гістарычнай памяці, афіцыйнае прызнанне і асуджэнне генацыду беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны і ў пасляваенны перыяд».

— Сёння спробы тых, хто імкнецца сцерці з памяці падзеі трагічных дзён ці перапісаць вынікі Вялікай Айчыннай і Другой сусветнай вайны, расставіць іншыя акцэнты ў гэтых падзеях, не толькі не маральныя, але і злачынныя з нашага пагляду, — пераканана **член Пастаяннай камісіі па правах чалавека, нацыянальных адносінах і СМІ Людміла ЗДОРЫКАВА**. — Наш святы абавязак — захаваць і абараніць памяць пакаленняў, якія падарылі мір, магчымасць нам і нашым дзецям быць гаспадарамі на нашай зямлі і ўпэўнена глядзець у заўтрашні дзень.

**Марыя ДАДАЛКА, Вераніка КАНЮТА.**

# «У ДОБРЫ ШЛЯХ, «НАШЫ ДЗЕЦІ»!

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Без перабольшання можна сказаць, што свята абнаўлення сёлета прыйшло найперш у капітальна адрамантаваны будынак Нацыянальнага цэнтра мастацкай творчасці дзяцей і моладзі на сталічнай вуліцы Фабрыцыуса. Вялікая колькасць жоўтых аўтобусаў з пазнакай «Дзеці» размясцілася на прылеглай вуліцы — маленькія ўдзельнікі ўрачыстасці прыехалі ў Мінск з усіх рэгіёнаў. Святочная мітусня ва ўпрыгожаных ёлкамі холах, навагоднія песні і роставыя лялькі адразу ствараюць асаблівую атмасферу, якая нават дарослаламу нагадвае пра тое, што хутка надыдзе асаблівая, чароўная пара, калі ўсе мы крыху становімся дзецьмі, загадваем самыя запаветныя жаданні і верым у цуд.

Сімвалічную кнопку, якая дала старт рэспубліканскай акцыі «Нашы дзеці», Ігар Петрышэнка разам са старшынёй праўлення Беларускага дзіцячага фонду Людмілай Кандрашовай і юнымі памочнікамі націснулі роўна ў 12 гадзін. Ва ўрачыстасці ўзялі ўдзел старшыня Цэнтрвыбаркама Ігар Карпенка, прадстаўнікі абласных і Мінскага гарадскога выканаўчых камітэтаў, рэспубліканскіх дзіцячых грамадскіх аб'яднанняў, педагогі і, вядома ж, дзеці з розных куткоў Беларусі. Такія ж мерапрыемствы ў гэты час распачаліся ва ўсіх абласных цэнтрах.

— Я рады вітаць усіх удзельнікаў у адрамантаваным будынку. Праўда, Дзед Мароз і Снягурка пакуль не стварылі чарадзейства — пах свежай фарбы яшчэ захоўваецца, — пажартаваў Ігар Петрышэнка. — Аднак, мяркую, сёння яны зробяць усё, каб у вас, першых гасцей, засталіся самыя станоўчыя эмоцыі ад старту акцыі «Нашы дзеці», якая праводзіцца па ініцыятыве Прэзідэнта ўжо больш за 25 гадоў. Гэтая акцыя ажыццяўляе цуд для кожнага дзіцяці. Дзякуй вам за вашу вучобу, добрыя адносіны да вашых равеснікаў, вашу творчасць, заняткі спортам. І няхай у жыцці вам спадарожнічаюць удача, моцнае здароўе і рэалізацыя ўсіх задум. Усё, што робіцца ў нашай краіне, робіцца дзеля вас — і спартыўныя, і культурныя аб'екты, і высокі ўзровень адукацыі. Таму тварыце, удасканальвайцеся, а бацькі, педагогі і выхавальнікі заўсёды будуць надзейнай апорай на вашым жыццёвым шляху. З надыходзячым святам і ў добры шлях, акцыя «Нашы дзеці»!

У размове з журналістамі намеснік прэм'ер-міністра краіны адзначыў: вельмі важна, што з кожным годам да ўдзелу ў дабрачыннай акцыі далучаецца ўсё больш арганізацый і ўстаноў.

— Гэта неабходна для таго, каб здзейсніць запаветную мару дзяцей, каб іх жаданні збываліся, каб яны задумваліся, кім стаць. Мы ствараем усе неабходныя ўмовы, каб дзеці атрымалі дастойную адукацыю. Наша задача, каб цеплыню і дабрыню, якую дораць дарослыя, дзеці перадавалі сваім аднагодкам, у цяжкую хвіліну маглі добрым словам, добрай справай, учынкам падтрымаць сваіх равеснікаў. Для нас гэта вельмі важна. На працягу месяца неабходна арганізавана правесці тэматычныя мерапрыемствы па ўсёй краіне, каб кожнае дзіця, дзе б яно ні пражывала — у буйным горадзе, сталіцы, абласным цэнтры або маленькай вёсачцы, — атрымала навагодні падарунак і яго жаданне спраўдзілася.

Як паведаміў Ігар Петрышэнка, ужо рыхтуецца «Чароўная казка» для дзяцей у Палацы Рэспублікі з удзелам кіраўніка дзяржавы. Навагодні баль запланаваны на 27 снежня, больш за 2,5 тысячы дзяцей з усёй краіны збярэцца на гэтае свята. Урачыстае мерапрыемства ў Палацы Незалежнасці пройдзе 24 снежня, дзе збяруцца стыпендыяты фонду Прэзідэнта, пераможцы рэспубліканскіх і міжнародных алімпіяд, грамадскія актывісты, пераможцы спартыўных спаборніцтваў. Такія ж балі з удзелам губернатараў пройдуць і ў абласных цэнтрах для дзяцей, якія дасягнулі поспехаў у вучобе, творчасці, спорце і грамадскай рабоце.



Фота БелТА.

Па традыцыі ў акцыі «Нашы дзеці» возьмуць удзел і кіраўнікі міністэрстваў, ведамстваў, грамадскіх арганізацый, прадпрыемстваў, банкаў і іншых арганізацый, яны наведаюць дзіцячыя інтэрнаты і дамы сямейнага тыпу, апякунскія і прыёмныя сем'і, сем'і, якія выхоўваюць дзяцей-інвалідаў, цэнтры карэкцыйна-развіццёвага навучання і рэабілітацыі, бальніцы. Прадстаўнікі ўстаноў краіны павіншуюць дзяцей з Новым годам, Калядамі і ўручаць падарункі, акажуць дапамогу ў вырашэнні праблем.

Без увагі не застанецца літаральна ні адно малое. Акажуць дапамогу і дзецям бежанцаў на беларуска-польскай граніцы.

— Мы спадзяёмся, што да Новага года колькасць дзяцей у гэтым цэнтры будзе меншая, бо разлічваем, што ў хуткім часе праблему ўдасца вырашыць. Калі ж па волі абставін там застануцца дзеці і дарослыя, то малыя не будуць абдзелены ні ўвагай, ні падарункамі. Яны паўдзельнічаюць у акцыі «Нашы дзеці». У Беларусі ўсе дзеці роўныя, яны ўсе чакаюць цуду і ніхто не застанецца без падарункаў, — падкрэсліў Ігар Петрышэнка.

**Алена КРАВЕЦ.**

Гучная справа

# МАСАВЫЯ БЕСПАРАДКІ, ГВАЛТ, ВАРОЖАСЦЬ

## Блогеру Ціханоўскаму прысудзілі 18 гадоў калоніі ўзмоцненага рэжыму

**Гомельскі абласны суд агучыў прысуд на выязным пасяджэнні ў следчым ізалятары. Па даных следства, абвінавачаны і яго набліжаныя працяглы час займаліся падрыхтоўкай і арганізацыяй масавых беспарадкаў у Беларусі, паведаміла БелТА. Пры гэтым блогер праз YouTube-канал і аднайменны тэлеграм-канал адкрыта заклікаў да гвалту ў адносінах да прадстаўнікоў улады і праваахоўнікаў. Сваімі выказваннямі ён распальваў варожасць і рознь у грамадстве па прыкметах сацыяльнай прыналежнасці.**

Даказана непасрэдная ўзаемасувязь учыненых блогерам злачынстваў з дзейнасцю экстрэмістаў, якія маніпулявалі грамадскай свядомасцю з дапамогай дэструктыўных тэлеграм-каналаў і іншых. Гэта пацвярджаецца матэрыяламі крымінальнай справы, аператыўна-вышуковай дзейнасці, заключэннямі праведзеных лінгвістычных і псіхалагічных экспертыз. Усяго да справы далучаны заключэнні больш як 70 экспертыз.

Таксама ў маі мінулага года Сяргей Ціханоўскі перашкодзіў рабоце Цэнтральнай камісіі па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў, адрасуючы пагрозы старшыні камісіі. Яшчэ адзін з эпізодаў таго перыяду: у Гродне абвінавачаныя арганізавалі пад выглядам пікету па зборы подпісаў незаконнае масавае мерапрыемства. Яно суправаджалася грубымі парушэннямі грамадскага парадку, гвалтам у адносінах да праваахоўнікаў, непадпарадкаваннем прадстаўнікам улады.

Улічваючы, што ўрон ад дзеянняў Ціханоўскага і набліжаных да яго асоб склаў больш як Br3,5 млн, на маёмасць і грашовыя сродкі абвінавачаных накладзены арышт. Сяргею Ціханоўскаму было прад'яўлена канчатковае абвінавачанне па наступных артыкулах Крымінальнага кодэкса: ч. 1 арт. 293 (арганізацыя масавых беспарадкаў), ч. 3 арт. 130 (распальванне сацыяльнай варожасці), ч. 2 арт. 191 (перашкаджэнне рабоце ЦВК), ч. 1 ст. 342 (арганізацыя дзеянняў, якія груба парушаюць грамадскі парадак).

Па гэтых жа артыкулах прад'яўлена абвінавачанне аператару Арцёму Сакову і праграмісту Дзмітрыю Папову. Таксама суд пастанавіў абвінаваўчыя прысуды Мікалаю Статкевічу, Ігару Лосіку і Уладзіміру Цыгановічу. Суд прыгаварыў Сакова і Папова да 16 гадоў калоніі ўзмоцненага рэжыму кожнага. Цыгановічу і Лосіку прызначана пакаранне ў выглядзе 15 гадоў калоніі ўзмоцненага рэжыму.

«Мікалай Статкевіч прыгавораны да 14 гадоў папраўчай калоніі ва ўмовах асаблівага рэжыму, паколькі ў яго дзеяннях судом была прызнана наяўнасць асабліва небяспечнага рэцыдыву злачынства. У яго ёсць непагашаная судзімасць па ч. 1 арт. 293 КК. Ён быў асуджаны ў 2011 годзе адным з раённых судоў Мінска», — распавёў **начальнік аддзела пракуратуры Гомельскай вобласці Дзяніс МІКУШАЎ**.

Па законе за дзеянні, якія ставіцца ў віну Сяргею Ціханоўскаму, прадугледжана 20 гадоў пазбаўлення волі. Аб гэтым паведаміў начальнік аддзела пракуратуры Гомельскай вобласці. Па яго словах, максімальны тэрмін для абвінавачанага быў 20 гадоў. Фактычна Ціханоўскаму прызначана пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі на два гады меншае, чым максімальны тэрмін, прадугледжаны законам.

З абвінавачаных у даход дзяржавы спагнаны матэрыяльны ўрон, прычынены злачынствамі, у памеры больш як 2,5 мільёна рублёў.

## Тым часам

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка 14 снежня падпісаў Закон «Аб змяненні Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь». Аб гэтым БелТА паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара.**

Законам уводзіцца крымінальная адказнасць за заклікі да прымянення санкцый у адносінах да Рэспублікі Беларусь, яе грамадзян і арганізацый. Гэтыя дзеянні будуць карацца пазбаўленнем волі на тэрмін да: шасці гадоў — калі заклікі звернуты да радавых асоб; дзесяці гадоў — калі яны звернуты да замежных дзяржаў, міжнародных і замежных арганізацый; дванаццаці гадоў — калі такія заклікі ўчынены службовай асобай з выкарыстаннем сваіх службовых паўнамоцтваў або прывялі да іншых цяжкіх наступстваў, напрыклад, абмежавання гандлю, уключэння прадпрыемстваў у санкцыйны спіс.

Рэалізацыя прадугледжаных законам мер будзе выступаць адэкватным адказам на спробы прычынення шкоды нацыянальнай бяспецы з боку дэструктыўных сіл.

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## СААЗ прагназуе рост колькасці шпіталізацый і смерцяў з-за штама «Амікрон»




Аб гэтым заявіла РІА «Навіны» ў прэс-службе арганізацыі. «Па меры павелічэння колькасці заражаных ва ўсім свеце мы чакаем з'яўлення інфармацыі аб колькасці выпадкаў шпіталізацыі і нават смерцяў», — дадалі ў агенцтве. Як вядома, надоечы Вялікабрытанія паведаміла аб першым смяротным зыходзе ад «Амікрона». «Многія краіны ўсё яшчэ не маюць магчымасцяў для паслядоўнага аналізу ўзораў усіх выпадкаў заражэнняў або смерцяў, таму інфармацыю аб смерцях, выкліканых канкрэтным варыянтам, цяжка дакладна вызначыць», — лічаць у СААЗ. Больш падрабязныя даныя аб цяжары «Амікрона» могуць з'явіцца ў найбліжэйшыя тыдні, паколькі павінен прайсці пэўны час паміж інфіцыраваннем і наступствамі.

## Associated Press абвінаваціла ўлады ЗША ў сачэнні за журналістамі

Інфармацыйнае агенцтва Associated Press (AP) запытала ў Міністэрства ўнутранай бяспекі (DHS) ЗША тлумачэнні наконт выкарыстання сакрэтных урадавых баз даных для сачэння за міжнароднымі тэрарыстамі з мэтай расследавання дзейнасці журналістаў. Адзначаецца, што ў лісце да кіраўніка DHS Алехандра Маёркаса выканаўчы рэдактар AP Джулі Пэйс запатрабавала растлумачыць, чаму імя журналіста агенцтва праходзіла па базах даных у якасці «патэнцыяльнага канфідэнцыяльнага інфарматара». «Гэта абуральны прыклад таго, як федэральныя ведамствы выкарыстоўвае свае паўнамоцтвы для праверкі кантактаў журналістаў. Хоць дзеянні, прыведзеныя ў дакладзе генеральнага інспектара, былі зроблены падчас папярэдняга адміністравання, гэтая практыка апісвалася як звычайная», — цытуе агенцтва словы Джулі Пэйс. На мінулым тыдні СМІ паведамілі, што спецыяльнае падраздзяленне Пагранічна-мытнай службы ЗША выкарыстоўвала канфідэнцыяльныя ўрадавыя базы даных, прызначаныя для адсочвання тэрарыстаў, для расследавання дзейнасці 20 амерыканскіх журналістаў, у тым ліку рэпарцёра AP.

## Маск стаў чалавекам года па версіі часопіса Time



Выканаўчы дырэктар Tesla і заснавальнік SpaceX Ілан Маск абраны чалавекам года — 2021 па версіі часопіса Time. «Гэты чалавек валодае экстраардынарным уплывам на жыццё на планеце Зямля і ў перспектыве, магчыма, на жыццё за яе межамі. Ад экзістэнцыяльнага крызісу змены клімату, ад праблем няроўнасці да новых меж магчымага — ніхто не ўвасабляе сабой тэмы гэтага года лепш, чым Ілан Маск», — абвясціў галоўны рэдактар часопіса Эдвард Фельзенталь. Аўтамабільная кампанія Tesla кантралюе дзве трэціны шматмільярднага рынку электрамабіляў і ацэньваецца ў $1 трлн. Маск з чыстым капіталам больш як $250 млрд з'яўляецца найбагацейшай прыватнай асобай у гісторыі. Са снежня 1927-га рэдакцыя Time аб'яўляе чалавека года. Яго фатаграфія размяшчаецца на вокладцы часопіса. Канкрэтных крытэрыяў для прысвоення гэтага звання няма: лічыцца, што яго атрымлівае той, хто на працягу года аказваў найбольшы ўплыў на грамадства незалежна ад таго, быў ён пазітыўны або негатыўны.

КАРАНІ І КРОНЫ

Сумесны выпуск газеты «Звязда» і Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя

№ 9 (63)




Гарачая тэма

# У БАРАЦЬБЕ СА ЗМЕНАЙ КЛІМАТУ ГАЛОЎНАЕ — ПАДТРЫМКА

**Адной з галоўных міжнародных падзей у сферы экалогіі ў канцы года стала 26-я канферэнцыя Бакоў Рамачнай канвенцыі ААН аб змене клімату (COP26) у горадзе Глазга (Шатландыя). Якія вынікі былі дасягнуты на гэтым форуме для нашай краіны?**

Вынікам Канферэнцыі стала пагадненне, мэта якога — максімальнае скарачэнне выкідаў парніковых газаў да 2030 года. Яно прадугледжвае паступовае скарачэнне выкарыстання вугалю як самага разбуральнага для экалогіі віду выкапнёвага паліва, павелічэнне фінансавай дапамогі найменш развітым краінам і тым, якія развіваюцца, для барацьбы са зменай клімату, аналіз работы і атрыманых вынікаў на больш рэгулярнай аснове.

Па словах **начальніка ўпраўлення рэгулявання ўздзеяння на атмасфернае паветра, змены клімату і экспертызы Мінпрыроды Наталіі ІНЧЫНАЙ**, якая прадстаўляла дэлегацыю Рэспублікі Беларусь, у цэлым правядзенне 26-й канферэнцыі Бакоў у фізічным фармаце зрушыла перагаворны працэс па рэалізацыі Парыжскага пагаднення з мёртвага пункта.

## Які ж асноўныя вынікі прынесла Канферэнцыя для Рэспублікі Беларусь?

Удзельнікі 26-й канферэнцыі Бакоў дамовіліся аб рабоце, якая праводзіцца ў нашай краіне па выкананні нацыянальных абавязацельстваў у рамках Парыжскага пагаднення і новага ўкладу ў скарачэнне выкідаў парніковых газаў, які вызначаецца на нацыянальным узроўні. Да 2030 года ў Беларусі плануецца скараціць выкіды парніковых газаў на 35 % да ўзроўню 1990 года за кошт фінансавых рэсурсаў краіны.

Дэлегацыя Беларусі змагла дабіцца пашырэння мандата рашэння «Пяты агляд ажыццяўлення рамак ўмацавання патэнцыялу ў краінах з пераходнай эканомікай» у параўнанні з рашэннем 2017 года. У адпаведнасці з ім, групе краін з пераходнай эканомікай, да якіх адносіцца і Беларусь, будзе дадавацца падтрымка не толькі для падрыхтоўкі нацыянальных паведамленняў і двухгадовых дакладаў па Рамачнай канвенцыі ААН аб змене клімату і Кіёцкім пратаколе, але і для рэгулярнага абнаўлення і ажыццяўлення сваіх паказчыкаў скарачэння выкідаў, стратэгій па адаптацыі, распрацоўкі і рэалізацыі нацыянальных доўгатэрміновых стратэгій з нізкім узроўнем выкідаў у адпаведнасці з нацыянальнымі прыярытэтамі, што прадугледжана Парыжскім пагадненнем.




Фота прэс-службы Мінпрыроды.

Падчас COP26 Беларусь далучылася да Дэкларацыі Глазга па лясах і землекарыстанні.

У рашэнні па Парыжскім пагадненні «Кіруючыя ўказанні для падрыхтоўкі Глабальнаму экалагічнаму фонду» і «Даклад Глабальнага экалагічнага фонду і кіруючыя ўказанні Глабальнаму экалагічнаму фонду» па ініцыятыве беларускага боку быў унесены тэкст аб неабходнасці аказання садзейнічання краінам, якія на дадзены момант з'яўляюцца атрымальнікамі падтрымкі ГЭФ па падрыхтоўцы двухгадовых справаздач па транспарэнтнасці, а таксама стварэння патэнцыялу справаздачнасці ў рамках Парыжскага пагаднення.

У працэсе фарміравання фінансавых і нефінансавых механізмаў Артыкула 6 Парыжскага пагаднення, якія будзе працягвацца ў 2022—2023 гадах, Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя сумесна з зацікаўленымі будзе браць актыўны ўдзел для забеспячэння нацыянальных інтарэсаў пры стварэнні сістэмы гандлю выкідамі парніковых газаў і сумесных праектаў па зніжэнні іх узроўню ў рамках Парыжскага пагаднення.

У дні кліматычнага форуму таксама адбыліся двухбаковыя сустрэчы з кіраўніцтвам і экспертамі Глабальнага экалагічнага фонду, Ініцыятывы па забеспячэнні транспарэнтнасці дзеянняў у сферы змены клімату (ICAT), Фонду кліматычных работ, прадстаўнікамі дэлегацый Расіі, Украіны, Швейцарыі, Ізраіля, Еўрапейскага саюза, у ходзе якіх абмяркоўваліся падыходы да рэалізацыі палажэнняў Парыжскага пагаднення, перспектывы супрацоўніцтва ў дадзенай сферы і прыцягненне дадатковага фінансавання для дасягнення Рэспублікай Беларусь укладу ў скарачэнне выкідаў парніковых газаў да 2030 года, што вызначаецца на нацыянальным узроўні.

Па выніках сустрэч рыхтуюцца праектныя прапановы ў сферы змены клімату для накіравання патэнцыяльным донарам і партнёрам.

**Веранiка КОЛАСАВА.**

Устойлівае развіццё

# Прырода — для турыстаў

**Як зрабіць, каб запаведныя тэрыторыі сталі цікавымі для наведвальнікаў, а мясцовае насельніцтва палепшыла свой дабрабыт?**



У краіне распрацавана 45 экалагічных сцежак і 176 турыстычных зялёных маршрутаў, 116 турыстычных стаянак.

**Гэтыя і іншыя пытанні абмеркавалі ўдзельнікі міжнароднай канферэнцыі «Новыя падыходы і паспяховыя практыкі ў развіцці экалагічнага турызму на асабліва ахоўных прыродных тэрыторыях як уклад у дасягненне Мэт устойлівага развіцця».**

### КАШТОЎНЫЯ АБ'ЕКТЫ

Мерапрыемства прайшло пры падтрымцы праекта міжнароднай тэхнічнай дапамогі «Развіццё экалагічнага турызму для садзейнічання зялёнаму пераходу да інклюзіўнага і ўстойлівага росту». Канферэнцыя сабрала ў гібрыдным фармаце больш за 170 экспертаў у сферы экатурызму з 11 краін, уключаючы Беларусь, Арменію, Азербайджан, Эстонію, Германію, Казахстан, Малдову, Расію, Славакію, Таджыкістан і Узбекістан. У ліку ўдзельнікаў былі эколагі, прадстаўнікі прыродных заказнікаў, нацыянальных паркаў, НДА, ВНУ і аграэкасядзіб.

Падчас адкрыцця мерапрыемства **міністр прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Андрэй ХУДЫК** адзначыў, што прырода — адно з галоўных багаццяў Беларусі і сярод усіх экасістэм найвялікшую каштоўнасць маюць асабліва ахоўныя прыродныя тэрыторыі (ААПТ). Менавіта гэтыя ўнікальныя прыродныя аб'екты найбольш цікавыя для развіцця экалагічнага турызму.

— Гэты перспектыўны кірунак закладзены ў Нацыянальную стратэгію развіцця сістэмы ААПТ да 1 студзеня 2030 года, зацверджаную Урадам Рэспублікі Беларусь, — адзначыў міністр.

Па яго словах, экалагічны турызм — гэта інструмент для павышэння ўзроўню ведаў аб важнасці прыроднай спадчыны, ён тым самым садзейнічае захаванню натуральных экасістэм, а таксама ў яго ёсць значны патэнцыял для ўстойлівага развіцця рэгіёнаў, паляпшэння дабрабыту мясцовага насельніцтва. Гэта адзін з кірункаў зялёнай эканомікі, які робіць значны ўнёсак у дасягненне Мэт устойлівага развіцця.

Андрэй Худык расказаў, што на тэрыторыях ААПТ узрастае папулярнасць правядзення экалагічных фестываляў, а Бярэзінскі біясферны запаведнік і нацыянальныя паркі сталі турыстычнымі брэндамі. Цяпер справа за рэспубліканскімі і мясцовымі заказнікамі, якія могуць павялічваць разнастайнасць і якасць экатурыстычных паслуг, фарміраваць зялёныя маршруты, уладкоўваць экалагічныя сцежкі, ствараць паўнавартасны экатурыстычны прадукт.

### ЧЫМ ПРЫВАБІЦЬ ГАСЦЕЙ?

Падчас канферэнцыі сваім вопытам і найлепшымі практыкамі ў сферы развіцця экалагічнага турызму на асабліва ахаваных тэрыторыях падзяліліся прадстаўнікі розных краін.

Дырэктар Нацыянальнага парку «Себежскі» Надзея Падаплёкіна расказала пра тое, як прыцягваюцца турысты на гэтую запаведную тэрыторыю. У 2020 годзе была распрацавана новая канцэпцыя экалагічнай асветы і турызму з кластарным падыходам. У яе аснове — знаёмства гасцей з нацпаркам праз ключавыя прафесіі: арнітолага, паляўнічтвазнаўца, іхтыёлага, пчаляра і іншыя. Для гэтага ствараюцца тэматычныя музеі, эколага-асветніцкія зоны, экасцежкі.

Святлана Бялова, дырэктар Асацыяцыі для аховы прыроды «Махаон Інтэрнэшэнэл» (Славакія) падзялілася вопытам стварэння праграмы партнёраў у Нацыянальным парку «Гесойзэ» ў Аўстрыі, мэта якой — устойлівае развіццё рэгіёна, падтрымка дробных вытворцаў і прадпрымальнікаў. Быў створаны новы брэнд нацпарку, які выкарыстоўваюць усе арганізацыі-партнёры. А замест аднаго інфармацыйнага цэнтра на тэрыторыі вакол нацпарку існуе 100 невялікіх, дзе звычайныя людзі расказваюць гасцям пра гэтыя мясціны. За апошнія пяць гадоў колькасць знаходжанняў у нацпарку з начлегам павялічылася на 23 %.

Пра тое, як развіваецца турызм у Бярэзінскім біясферным запаведніку, расказала намеснік дырэктара па турызме гэтай установы Алена Альшэўская. У апошнія гады тут быў створаны Цэнтр міфалагічнага турызму, які ўключае Музей славянскай міфалогіі, сцежку «У свеце міфаў», праводзіцца фестываль «Шлях Цмока». Экалагічныя веды перадаюцца праз прызму беларускай міфалогіі, якая вучыць чалавека дружнаму суіснаванню з прыродай.

На тэматычных секцыях эксперты ацэньвалі, наколькі экалагічны турызм з'яўляецца важным элементам кіравання ААПТ, а таксама ці дапамагае ён устойліва развіваць рэгіёны, абмяркоўвалі асноўныя праблемы, якія сёння датычацца развіцця экалагічнага турызму.

### ЧАС ЗМЯНЯЦЦА

Актыўны ўнёсак у арганізацыю канферэнцыі зрабіў праект «Развіццё экалагічнага турызму для садзейнічання зялёнаму пераходу да інклюзіўнага і ўстойлівага росту», які рэалізуецца ПРААН сумесна з Мінпрыроды пры фінансавай падтрымцы Расійскай Федэрацыі.

Пандэмія COVID-19 моцна паўплывала на турыстычную галіну ў свеце, у тым ліку і ў Беларусі. Знізіліся знешнія турыстычныя патокі, упалі аб'ёмы выручкі ўнутранага турызму. Пры гэтым пандэмія паказала — прыродныя тэрыторыі, дзе даволі развітая інфраструктура, больш выйграюць у такой сітуацыі. Таму іншым заказнікам важна шукаць і ўкараняць новыя бізнес-мадэлі ў сферы турызму, уключаючы стварэнне рэгіянальных турыстычных кластараў. У рамках адпаведнага праекта будуць створаны тры такія кластары.

### ЛІЧБАВАЯ ТРАНСФАРМАЦЫЯ

Ва ўмовах ковідных абмежаванняў стаў асабліва запатрабаваным віртуальны турызм. Ён дапамагае знаходзіць альтэрнатыўныя спосабы падарожнічаць па свеце і новыя кірункі развіцця галіны.

Падчас рэалізацыі праекта будуць распрацаваны віртуальныя туры, электронныя даведнікі з лічбавымі GPS-навігатарамі і іншыя рашэнні, якія зробяць падарожжы інтэрактыўнымі і дазволяць адпраўляцца ў віртуальныя прагулкі па заказніках з розных пунктаў свету.

### ПАВЯЛІЧЫЦЬ ІНКЛЮЗІЎНАСЦЬ

Паводле даных СААЗ, сёння каля 15 % жыхароў планеты — людзі з інваліднасцю, гэтая лічба пастаянна расце, і такія падарожнікі становяцца ўсё больш масавай турыстычнай аўдыторыяй.

У рамках праекта будзе палепшана інфраструктура заказнікаў, каб зрабіць яе больш даступнай для падобных турыстаў. Пройдзе таксама шэраг трэнінгаў для прадстаўнікоў прыродаахоўных устаноў, мясцовых жыхароў, прадпрымальнікаў, рамеснікаў і іншых, па сацыяльнай адказнасці і стварэнні роўных магчымасцяў для наведвання ААПТ людзьмі з інваліднасцю.

### БІЗНЕС ДЛЯ ЖАНЧЫН

Праект таксама зробіць унёсак у забеспячэнне гендарнай роўнасці і пашырэнне правоў і магчымасцяў жанчын. Паводле даных Сусветнай турысцкай арганізацыі, сёння ў свеце жанчыны складаюць большую частку занятых у сферы турызму — 54 %. У жанчын у рэгіёнах Беларусі з'явіцца магчымасць прайсці навучанне і стаць сертыфікаваным гідам-экскурсаводам, а ў гаспадынь аграсядзіб — навучыцца весці адказны бізнес у сферы турызму.

**Настасся АЛЯКСЕЕВА,**
**фота аўтара.**

Міжнароднае супрацоўніцтва

# Прагнозы, маніторынг, рэкамендацыі...

## Як супрацоўнічаюць гідраметэаслужбы Расіі і Беларусі

**Разумець і прагназаваць надвор'е, ліквідаваць наступствы стыхій, павышаць устойлівасць да кліматычных змен. Гэтыя і іншыя гідраметэаралагічныя пытанні ўжо чвэрць стагоддзя сумесна вырашаюць беларускія і расійскія спецыялісты, «выбудоўваючы адзіную гідраметэаралагічную палітыку на еўрапейскай частцы кантынента», адзначылі эксперты падчас чарговага пасяджэння сумеснай калегіі Камітэта Саюзнай дзяржавы (СД) па гідраметэаралогіі і маніторынгу забруджвання прыроднага асяроддзя. Удзельнікі калегіі абмеркавалі праект канцэпцыі праграмы Саюзнай дзяржавы ў галіне гідраметэаралогіі і сумежных з ёю сферах на 2023—2027 гады.**

Сумесная работа па праграме «Развіццё сістэмы гідраметэаралагічнай бяспекі СД» на 2017—2021 гады была рэалізавана ў рамках пяці мерапрыемстваў, удзельнікі абмеркавалі дасягненні ў кожным з іх. У напрамку «Павышэнне якасці гідраметэаралагічных прагнозаў і выяўлення небяспечных гідраметэаралагічных з'яў» была створана тэхналагічная лінія для аператыўнага выкарыстання адаптаванай мадэлі COSMO-RuBy, а таксама забяспечаны рэгулярны выпуск прагнастычнай прадукцыі па мадэлі атмасферы і распрацаваны метады кароткатэрміновага і звышкароткатэрміновага прагназавання небяспечных гідраметэаз'яў.

Як паведамілі дакладчыкі, дзякуючы сумеснай рабоце апраўдвальнасць папярэджанняў аб небяспечных прыродных з'явах была даведзена да 92 %, а апраўдвальнасць сутачных прагнозаў па суб'ектах еўрапейскай часткі Расіі і абласных цэнтрах Беларусі — да 94-96 %. Атрыманыя вынікі дазваляюць павысіць якасць гідраметэаралагічнага забеспячэння і тым самым знізіць страты ў эканоміцы ад уздзеяння неспрыяльных з'яў надвор'я і небяспеку жыццядзейнасці людзей.

*— Мы высока ацэньваем удзел беларускага боку і вітаем узаемадзеянне на раўнапраўнай аснове ў вырашэнні пытанняў і задач, якія мы абмяркоўваем і вырашаем сумесна на працягу многіх гадоў,* — канстатаваў **Ігар ШУМАКОЎ, кіраўнік Расгідрамета**. — *Напэўна, з ніводнай больш гідраметэаслужбай у нас няма такой паспяховай вялікай работы і супрацоўніцтва.*

*— Паміж нашымі службамі выбудаваны прафесійныя ўстойлівыя зносіны, напрацавана шмат станоўчага вопыту. Матэрыялы і даследаванні з абодвух бакоў узбагачаюць нашу гідраметэаралагічную сістэму,* — адзначыў **Баляслаў ПІРШТУК, першы намеснік міністра прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Беларусі**.

Другі кірунак работ датычыцца распрацоўкі і ўкаранення ў тэставым рэжыме сучасных метадаў, тэхналогій і сістэм кантролю і маніторынгу тэрытарыяльнага і трансгранічнага забруджвання наваколля. Спецыялістамі распрацаваны прапановы па ўдасканаленні маніторынгу на трансгранічных участках Заходняй Дзвіны, Дняпра, Сожа, Іпуці. Як вынік, была распрацавана методыка біятэсціравання на тэст-аб'ектах з прыродных папуляцый ніжэйшых ракападобных, а аператыўнасць ацэнкі забруджвання навакольля пры трансгранічным аварыйным забруджванні даведзена да дзвюх гадзін. Праз укараненне ўдасканаленай сістэмы маніторынгу ў выпадку аварыі аператыўнасць атрымання вынікаў стану забруджвання трансгранічных рэк можна павысіць з аднаго разу на дзень (месяц) да 20 хвілін (гадзіны) у залежнасці ад настроек абсталявання.

У межах трэцяга кірунку супрацоўніцтва створаны электронна-кліматычны даведнік па сумежных тэрыторыях Расіі і Беларусі (Смаленская, Бранская, Пскоўская і Віцебская, Магілёўская, Гомельская вобласці). Колькасць адрасных карыстальнікаў кліматычнай інфармацыяй пры гэтым павялічылася на чвэрць. Таксама распрацаваны рэкамендацыі па адаптацыі сельскай гаспадаркі для еўрапейскай тэрыторыі Расіі, сумежнай з Беларуссю, адносна сцэнарыяў змянення клімату ў XXI стагоддзі. Паводле разлікаў вучоных, выкананне рэкамендацый дазволіць павысіць узровень абароненасці галін эканомікі і грамадства ад уздзеяння небяспечных гідраметэаз'яў на 30 %.

Спецыялісты абедзвюх краін займаліся таксама доследнай эксплуатацыяй тэхналогій для выкарыстання інфармацыі з касмічных апаратаў гідраметэапрызначэння. А ў сферы гарманізацыі адзінай метадалагічнай базы СД складзены класіфікатар арганізацыйна-распарадчых, прававых дакументаў і наладжаны доступ да электроннай базы гэтых папер праз інтэрнэт.

Чарговае пасяджэнне гідраметэаслужбаў СД, як мяркуецца, адбудзецца налета ў маі-чэрвені ў расійскім Іркуцку, а наступнае — у беларускай Оршы напрыканцы 2022-га.

**Ірына СІДАРОК.**

# НАДВОР'Е БЕЗ МЕЖ

## Якую ролю Белгідрамет адыгрывае ў Сусветнай метэаралагічнай арганізацыі

### АБ'ЯДНАЦЬ І ЎМАЦАВАЦЬ

Сусветная метэаралагічная арганізацыя (СМА) — установа Арганізацыі Аб'яднаных Нацый, якая забяспечвае каардынацыю дзейнасці ў галіне метэаралогіі, гідралогіі і сумежных галінах ва ўсім свеце, садзейнічае эфектыўнаму абмену гідраметэаралагічнай і іншай адпаведнай інфармацыяй паміж краінамі на карысць людзей. Яна існуе для таго, каб умацоўваць сусветнае супрацоўніцтва ў стварэнні сеткі станцый, якія праводзяць метэаралагічныя, гідралагічныя і іншыя геафізічныя назіранні. А таксама спрыяе стварэнню і падтрымцы цэнтраў, што забяспечваюць гідраметэаралагічныя і іншыя віды абслугоўвання. У аснове такога падыходу — разуменне таго, што пагодныя сістэмы выходзяць за межы нацыянальных граніц і пастаянна ўзаемадзейнічаюць адна з адной.

СМА ўзначаліла намаганні сусветнай супольнасці па папярэджанні чалавецтва аб магчымых наступствах павелічэння ўзроўняў канцэнтрацыі парніковых газаў, уключаючы глабальнае пацяпленне, змену клімату і павышэнне ўзроўню мора. Арганізацыя выступіла сузаснавальніцай Міжурадавай групы экспертаў па змене клімату, а адыграла вызначальную ролю ў прыняцці Рамачнай канвенцыі ААН аб змене клімату, а таксама стала ініцыятарам распрацоўкі Глабальнай рамачнай асновы для кліматычнага абслугоўвання.

**У склад Сусветнай метэаралагічнай арганізацыі ўваходзяць 193 краіны-члены і тэрыторыі.**



Аграметэаралагічная станцыя Васілевічы.

Функцыянаванне нацыянальнай гідраметэаралагічнай службы (НГМС) у любой краіне заснаванае на назіраннях і зборы даных і іх апрацоўцы; тэлекамунікацыях, падрыхтоўцы гідраметэаралагічных і кліматычных прагнозаў, папярэджанняў аб небяспечных і неспрыяльных умовах надвор'я, а таксама распаўсюджванні інфармацыі сярод карыстальнікаў праз СМІ і іншыя каналы. Гэта дасягаецца з дапамогай спалучэння мноства сетак, цэнтраў і канцэнтратараў у нацыянальным, рэгіянальным і глабальным маштабах для фарміравання цесна ўзаемазвязанага свету глабальнай гідраметэаралогіі. Сістэма Сусветнай службы надвор'я СМА складаецца з трох кампанентаў:

1) назіранне;
2) тэлекамунікацыя і апрацоўка даных;
3) прагназаванне.




### З ВАСІЛЕВІЧ — У ГЛАБАЛЬНУЮ ПРАСТОРУ

Дзяржаўная гідраметэаралагічная служба Беларусі, якая прадстаўлена Рэспубліканскім цэнтрам па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя (Белгідраметам), мае шмат напрамкаў для супрацоўніцтва з СМА. Гэта правядзенне гідраметэаралагічных назіранняў у адпаведнасці з міжнародна ўзгодненымі стандартамі, аператыўны абмен інфармацыяй, маніторынг клімату Беларусі, павышэнне эфектыўнасці практычнага прымянення гідраметэаралагічнай інфармацыі, гідралагічны маніторынг, ацэнка колькасці і якасці водных рэсурсаў і іншае.

Дзеючая дзяржаўная сетка прыземных метэаралагічных назіранняў нашай краіны складаецца з пунктаў назіранняў, якія з дастатковай дакладнасцю забяспечваюць вымярэнні метэаралагічных параметраў і характарыстык ва ўстаноўленыя тэрміны назіранняў Сусветнага каардынаванага часу. Восем разоў на сутکі даныя назіранняў паступаюць у міжнародны абмен.

Гідраметэаралагічная інфармацыя перадаецца ў сусветныя цэнтры даных СМА: Усерасійскі навукова-даследчы інстытут гідраметэаралагічнай інфармацыі — Сусветны цэнтр даных (г. Обнінск, Расія), Міжнародны цэнтр даных па гідралогіі азёр і вадасховішчаў пры Дзяржаўным гідралагічным інстытуце (г. Санкт-Пецярбург, Расія). Даныя гідралагічных назіранняў выкарыстоўваюцца інфармацыйна-аналітычным цэнтрам маніторынгу паверхневых вод для падрыхтоўкі аналітычнай інфармацыі, штомесячнага прагназавання якасці вады вадацёкаў, для разліку масапераносу забруджвальных рэчываў на трансгранічных участках водных аб'ектаў.

Ёсць у нашай краіне і пункты назіранняў, якія ўваходзяць у склад Глабальнай сістэмы назіранняў за кліматам СМА. Да 2020 года аграметэаралагічная станцыя Васілевічы была адзіным такім аб'ектам. Але ў пачатку 2021 года ў сістэму была ўключана яшчэ адна беларуская метэаралагічная станцыя — Верхнядзвінск.

Белгідраметам штомесяц фарміруецца абагульненая метэаралагічная інфармацыя і перадаецца ў СМА ў выглядзе зводак «КЛІМАТ-СІНОП» для міжнароднага абмену. Таксама рыхтуецца матэрыял па кліматычных асаблівасцях мінулага года для публікацыі ў Штогадовым бюлетэні па кліматe і Заяве СМА аб стане глабальнага клімату.

### ІНТАРЭСЫ КАРЫСТАЛЬНІКАЎ — НА ПЕРШЫМ МЕСЦЫ

Найскладанейшая глабальная сістэма назіранняў — адзін з найбольш маштабных і паспяховых прыкладаў міжнароднага супрацоўніцтва за апошнія 100 гадоў. Яна складаецца з шэрагу індывідуальных сістэм назіранняў, якія належаць і эксплуатуюцца мноствам НГМС. Праз Глабальную сістэму тэлекамунікацый Сусветная служба надвор'я збірае і распаўсюджвае інфармацыю, якая мае важнае значэнне для яе працэсаў. Гэтая сістэма ўкаранёная і эксплуатуецца нацыянальнымі гідраметэаралагічнымі службамі ў краінах — членах СМА і міжурадавых арганізацыях, напрыклад Еўрапейскім цэнтры сярэднетэрміновых прагнозаў надвор'я і Еўрапейскай арганізацыі па эксплуатацыі метэаралагічных спадарожнікаў EUMETSAT.

**Рэспубліка Беларусь з'яўляецца членам Сусветнай метэаралагічнай арганізацыі з 1948 года.**

Пры гэтым галоўнае абавязацельства нацыянальных гідраметэаралагічных службаў — даваць гідраметэаралагічную, кліматычную і іншую інфармацыю ў інтарэсах грамадства і ставіць інтарэсы карыстальнікаў на першае месца. Ім патрэбныя паслугі гідраметэаролагаў не толькі ў штодзённым жыцці, але і пры прыняцці рашэнняў у выпадку прагназавання небяспечных прыродных з'яў. Імкнучыся да правядзення абслугоўвання, якое лепш за ўсё адказвае патрэбам людзей, НМГС Беларусі на належным узроўні забяспечвае выкананне сваіх абавязацельстваў. Правядзенне якаснага абслугоўвання ляжыць у аснове місіі і штодзённай работы Сусветнай метэаралагічнай арганізацыі.

**Ганна МАЦЭВІЛА, начальнік службы міжнароднага супрацоўніцтва і сувязяў з грамадскасцю Белгідрамета.**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | **ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5, корп. 2, пом. 1703** |
| **Продавец** | **ОАСО «Би энд Би иншуренс Ко», г. Минск, ул. Я. Коласа, 38. Тел. + 375 29 688-04-88** |

**Предмет аукциона**

**Лот № 1**
Местоположение **– г. Минск, ул. Замковая, 33**

**Офисная мебель и оргтехника в составе 437 единиц:** ПЭВМ, коммутаторы, кондиционеры, счетчики банкнот, копировальные аппараты, пожарная сигнализация, источники бесперебойного питания, компьютерная сеть, система симметричной связи, счетно-денеж. машинки, мебель, кабельная телефонная линия, системы вентиляции и кодиционирования воздуха, сейфы, комплекты перегородок, аппарат нагрева-охлаждения воды, рольшторы (полный перечень см. на сайте организатора аукциона **ipmtorgi.by**)

**Начальная цена лота № 1 (с НДС 20 %) – 128 681,28 бел. руб.**
(снижена на 30 %)
**Шаг аукциона – 6 434,06 бел. руб.**

**Лот № 2**
Местоположение – **г. Минск, ул. Лили Карастояновой, 32-19**

| Наименование (назначение) | Общая площадь | Инвентарный номер |
|---|---|---|
| **Помещение санитарно-бытового назначения** | 1,7 кв. м | 500/D-7028275 |

**Начальная цена лота № 2 (с НДС 20 %) – 3 108,00 бел. руб.**
(снижена на 30 %)
**Шаг аукциона – 155,40 бел. руб.**

**Лот № 3**
**Местоположение – г. Минск, ул. Замковая, д. 33-6**

| Наименование (назначение) | Общая площадь | Инвентарный номер |
|---|---|---|
| **Административно-торговое помещение** | 733,5 кв. м | 500/D-7023833 |

**Начальная цена лота № 3 (с НДС 20 %) – 1 624 560,00 бел. руб.**
(снижена на 30 %)
**Шаг аукциона – 81 228,00 бел. руб.**

**Лот № 4**
Местоположение **– г. Минск, ул. Замковая, д. 33-1а**

| | | |
|---|---|---|
| **Кабинеты** (административное помещение) | 87,9 кв. м | 500/D-708041778 |

Составные части и принадлежности: открытая автостоянка пл. 523 кв. м

**Начальная цена лота № 4 (с НДС 20 %) – 289 800,00 бел. руб.**
(снижена на 30 %)
**Шаг аукциона – 14 490,00 бел. руб.**

***Сведения о земельном участке по лотам № 3 и № 4:*** пл. **0,1469 га** предоставлен продавцу на праве общего долевого постоянного пользования (доля: 17/50) для эксплуатации и обслуживания административного здания с магазином. ***Ограничения (обременения) прав:*** после продажи земельный участок будет разделен в долях с установлением сервитута

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с BY92BELB30120048350080226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, ул. Мясникова, 32; БИК BELBBY2X; УНП 191224638; ОКПО 378531865000, получатель платежа: ООО «ИПМ-Консалт оценка»

| | |
|---|---|
| **Срок подписания договора купли-продажи** | **10 (десять) рабочих дней** после проведения аукциона |

**Условия оплаты предмета аукциона:** предмет аукциона должен быть оплачен покупателем в течение **20 (двадцати) рабочих дней** со дня проведения аукциона

**Порядок ознакомления:** в рабочие дня по предварительному согласованию +375 (29) 680-80-99 (Шубко Юлия Владимировна)

**Порядок оформления участия в аукционе и результатов торгов:** аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов, утвержденным постановлением Совмина РБ от 8 января 2013 г. № 16 «О некоторых вопросах продажи имущества ликвидируемого юридического лица». К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору аукциона в указанный в извещении срок заявление с приложением всех необходимых документов, в том числе документ, подтверждающий внесение задатка с отметкой банка, в размере 10 % от начальной цены предмета аукциона, зарегистрированные в журнале регистрации заявлений на участие в торгах, и заключившие с организатором торгов договор о задатке. С подробной информацией о перечне предоставляемых документов, образцами заявления на участие в аукционе и договора о задатке, а также правилами проведения аукциона можно ознакомиться на сайте организатора аукциона **ipmtorgi.by**

В случае признания торгов несостоявшимися в связи с тем, что заявление на участие в них было подано только одним участником либо для участия в них явился только один участник, возможна продажа предмета торгов этому участнику, по начальной цене, увеличенной на 5 %

Победитель аукциона либо единственный участник, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, обязан возместить затраты на организацию и проведение аукциона, а также оплатить вознаграждение организатору аукциона, исчисляемое в процентном соотношении от цены продажи (4 % – по лотам № 1, 2; 2 % – по лоту № 3, 3 % – по лоту № 4) в течение 5 (пяти) рабочих дней со дня проведения аукциона

Извещение о проведении предыдущего аукциона опубликованы в газете «Звязда» от 24.11.2021

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

| | |
|---|---|
| **Дата и время проведения аукциона** | **29.12.2021 в 13.00**, по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ООО «ИПМ-Консалт оценка» |
| **Дата и время начала и окончания приема заявлений** | **С 09.00 15.12.2021 до 17.00 28.12.2021** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ООО «ИПМ-Консалт оценка» |

**Контактные телефоны: +375 17-280-36-37; +375 44-704-92-06.**
**E-mail: auction@ipmconsult.by**

---

## РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ» (Организатор аукциона) извещает о проведении открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «НЗГА» (Продавец)

## ЛОТ № 1: ЗДАНИЕ СКЛАДА СТРОИТЕЛЬНЫХ И РАСХОДНЫХ МАТЕРИАЛОВ,

инв. № 430/С-54581, 1341,5 кв. м.

Адрес:
Гродненская обл., Новогрудский р-н, г. Новогрудок, ул. Советская, д. 77.
**Начальная цена с НДС** – 251 760,00 руб. **Задаток** – 25 176,00 руб.
**Штраф** – 25 000,00 руб.

Земельный участок с кадастровым номером 424350100001005696 площадью 1,4201 га. Право постоянного пользования. Переход права на земельный участок осуществляется в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь.

Аукцион состоится **17.01.2022 в 11.00** по адресу: Гродненская область, г. Новогрудок, ул. Мицкевича, 109, 4-й этаж, актовый зал. **Шаг аукциона** – 5 %.

Порядок оформления участия в аукционе, условия аукциона и полный текст извещения содержатся на сайте Организатора аукциона **ino.by.**

Задаток перечисляется на р/с BY85BAPB30127802900100000000 ОАО «Белагропромбанк», г. Минск ул. Романовская Слобода, 8, BIC банка BAPBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182.

Окончание приема заявлений с прилагаемыми к ним документами – **13.01.2022 в 11.00**.

**Организатор аукциона:**
**220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9,**
**☎ 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52**
**• www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by**

УНП 190055182

---

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению антикризисного управляющего ООО «Юрстайл групп» (220035, г. Минск, ул. Тимирязева, 67, офис 1404) проводит в процедуре экономической несостоятельности (банкротстве) на основании Определения Экономического суда Минской области от 11.06.2021 по делу № 290-17Б/2019 открытый повторный аукцион по продаже имущества ОАО «Молодечненское АТП» (222310, Минская область, г. Молодечно, ул. Нагорная, 5, УНП 600077154) в составе:**

| № лота | Наименование | Начальная цена, без учёта НДС, бел. руб. | Задаток, бел. руб. |
|---|---|---|---|
| 1 | **Автомобиль грузовой специальный (цистерна) MAZ-533605 220**, 2007 г. в., регистрационный знак 5 KX T 7356, цвет – белый, кузов (рама) № Y3M53360570001077 | 10 920,00 | 1 092,00 |
| 2 | **Станок токарный-винторезный 1В-62Г, инв. № 66, 1984 г. в.,** с выемкой в станине. Класс точности Н (нормальный). Наибольший диаметр заготовки над станиной 445 мм. Наибольший диаметр заготовки над суппортом 220 мм. Наибольшая длина заготовки РМЦ= 1000 мм. Габариты: 2800*1190*1450 мм. Мощность электродвигателя главного привода 7,5 кВт. Масса станка 2430 кг. Изготовитель: «Астраханский станкостроительный завод», г. Астрахань, РСФСР | 3 150,00 | 315,00 |

*Начальная цена снижена на 30 %.*

**Объекты расположены по адресу: Минская область, г. Молодечно, ул. Нагорная, 5г.**

Шаг аукциона – 5 (пять) процентов.

**Задатки (10 % от начальной цены) перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ОАО «Сбер Банк», г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, ОКПО 29250255 государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».** Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 30 (тридцати) календарных дней со дня проведения аукциона, если иной срок не будет установлен собранием (комитетом) кредиторов

**Победитель аукциона (единственный участник аукциона) в течение 5 (пяти) банковских дней со дня проведения аукциона оплачивает вознаграждение в размере 10 % от цены продажи предмета аукциона и возмещает затраты на публикацию.**

Условия аукциона:

- имущество приобретается на условиях 100 % предоплаты и оплаты Покупателем (единственным участником) аукциона комиссионного вознаграждения банку за проведения данного платежа;
- Покупатель обязан за свой счет принять приобретаемое имущество, в том числе осуществление вывоза, хранения, погрузочно-разгрузочных работ;
- на Покупателя возлагается обязанность по переоформлению (в ГАИ, военкомате), снятию и постановке на учёт приобретаемого имущества за свой счет.

Лица, желающие участвовать в торгах, обязаны подать организатору торгов, в указанный в извещении о проведении торгов срок, заявление на участие в торгах с приложением следующих документов:

- заверенного банком документа, подтверждающего внесение суммы задатка на текущий (расчетный) банковский счет, указанный в извещении о проведении торгов;
- для индивидуального предпринимателя – копии свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя (без нотариального засвидетельствования);
- для юридического лица – доверенности, выданной представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), а также копии свидетельства о государственной регистрации юридического лица (без нотариального засвидетельствования);
- для иностранного юридического лица, иностранной организации, не являющейся юридическим лицом, созданной в соответствии с законодательством иностранных государств иностранным государством и его административно-территориальными единицами в лице уполномоченных органов, международной организации – легализованных в установленном порядке копий учредительных документов, выписки из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течении шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иного эквивалентного доказательства статуса юридического лица в соответствии с законодательством страны происхождения, документа о финансовой состоятельности, выданного обслуживающим банком (без нотариального засвидетельствования);
- для представителя гражданина Республики Беларусь, в том числе индивидуального предпринимателя, – доверенности, оформленной в соответствии с законодательством.

При подаче документов на участие в торгах граждане Республики Беларусь, иностранные граждане и лица без гражданства, а также граждане Республики Беларусь, постоянно проживающие за пределами Республики Беларусь, в том числе представители юридических лиц Республики Беларусь, предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

Победителем признается участник торгов, предложивший наиболее высокую цену приобретения лота по сравнению с предложениями других лиц.

Участникам, не признанным победителями, задаток возвращается в безналичной форме в течение 5 рабочих дней с даты проведения торгов.

Результаты торгов оглашаются публично в день проведения торгов.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником, предмет торгов продается этому частнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Организатор аукциона вправе отказаться от их проведения не позднее чем за пять дней до даты их проведения.

Порядок проведения торгов и оформление участия в торгах определяется Законом Республики Беларусь от 13.07.2012 № 415-З «Об экономической несостоятельности (банкротстве)». Предыдущее извещение было опубликовано в газете «Звязда» от 28.08.2021, 09.11.2021.

Аукцион состоится **06.01.2022 в 14.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324.** Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **05.01.2022** до **16.00** по указанному адресу.

**Тел.: (8017) 516-80-65, 516-80-64, (8029) 102-21-17,**
**телефон для осмотра: (8029) 687-59-23; (8017) 396-61-34.**

УНП 600077154

---

## ИЗВЕЩЕНИЕ о проведении 27 декабря 2021 года повторных аукционных торгов с условиями по продаже имущества, принадлежащего УП «Ошмянский дрожжевой завод»

| Сведения о продаваемом имуществе | |
|---|---|
| **Наименование, характеристики и местонахождение продаваемого имущества:** капитальное строение с инвентарным номером 442/С-9363 общей площадью 136,8 кв. м, расположенное по адресу: Гродненская обл., Островецкий р-н, Гудогайский с/с, п. Гудогай, ул. Школьная, 9/2 , наименование – материальный склад, назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ; капитальное строение с инвентарным номером 442/С-9362 общей площадью 155 кв. м, расположенное по адресу: Гродненская обл., Островецкий р-н, Гудогайский с/с, п. Гудогай, ул. Школьная, 9/1, Материальный склад солей, наименование – материальный склад солей, назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, составные части и принадлежности: ограждение (а), ограждение (б), ворота (в), ворота (г); капитальное строение с инвентарным номером 442/С-9404 общей площадью 16 кв. м, расположенное по адресу: Гродненская обл., Островецкий р-н, Гудогайский с/с, п. Гудогай, ул. Школьная, 9, наименование – административно-бытовое здание, назначение – здание административно-хозяйственное; котел Е1/9 инв. номер 508, устройство водоочистное ХВО ФС 1015/40МСЕ инв. номер 511, насос П6-ППВ инв. номер 499, насос Grundfos SQ 3-55 1.15kW инв. номер 460, лебедка тяговая г/п 2т ЛМ-2 инв. номер 20018, емкость цилиндрическая для хранения мелассы 423,8 куб. м инв. номер 200127, емкость цилиндрическая для хранения мелассы 423,8 куб. м инв. номер 200128, емкость цилиндрическая для хранения мелассы 807,1 куб. м инв. номер 328, емкость цилиндрическая для хранения мелассы 1 723,4 куб. м инв. номер 329, емкость цилиндрическая для хранения мелассы 1 014 куб. м инв. номер 273, емкость цилиндрическая для хранения мелассы 1 702,5 куб. м инв. номер 325, емкость кубическая для слива мелассы инв. номер 413 | |
| **Сведения о земельном участке:** право постоянного пользования на земельный участок площадью 0,3680 га, кадастровый номер – 424681306601000441, целевое назначение земельного участка – для размещения объектов неустановленного назначения (содержания и обслуживания зданий и сооружений) | |
| **Начальная цена:** 302 000,0 бел. руб. с учетом НДС | **Сумма задатка**: 30 200,0 бел. руб. |

**Продавец имущества:** УП «Ошмянский дрожжевой завод», ул. Борунская, 15, 231103, г. Ошмяны.

**Организатор торгов:** государственное предприятие «МГЦН», ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск.

**Условия торгов:** победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 3 процентов от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов.

Торги проводятся в соответствии со ст.ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества, принадлежащего УП «Ошмянский дрожжевой завод», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, внесшие задаток и заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона по соответствующему предмету торгов, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка, документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

*Задаток перечисляется в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе, на расчетный счет государственного предприятия «МГЦН» р/с BY15 BLBB 3012 0190 3985 8300 1001 в ЦБУ № 527 ОАО «Белинвестбанк» г. Минск, БИК BLBBBY2X, получатель – государственное предприятие «МГЦН», УНП 190398583, назначение платежа – задаток для участия в аукционных торгах от 27.12.2021.*

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается после предъявления копии платежных документов о перечислении суммы вознаграждения за организацию и проведение торгов и подписывается в течение 10 рабочих дней со дня проведения торгов.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи.

Торги проводятся **27 декабря 2021 года в 15.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 7 (зал аукционов). Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются **с 15.12.2021 по 23.12.2021** включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.30) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

По вопросу ознакомления с продаваемым имуществом следует обращаться по телефону: (044) 533 04 14.

**Телефоны для справок:** (017) 365-48-36 (государственное предприятие «МГЦН»); (044) 533 04 14, (1593) 4 51 26 (УП «Ошмянский дрожжевой завод». Дополнительная информация размещена на сайте **www.mgcn.by** в разделе «Недвижимость в собственность».



# МІКРОБЫ — ДЛЯ ЗДАРОЎЯ

## Навукоўцы шукаюць спосабы, як дапамагчы людзям жыць доўга, актыўна і ў радасць

**Мікрабіём кіруе ўсім светам. Гэта ўнікальная супольнасць мікраарганізмаў, якія засяляюць канкрэтнае асяроддзе — тканкі і органы жывых арганізмаў, глебу, водныя экасістэмы і г. д. У прыватнасці, у нашым арганізме ўтрымліваецца больш як 35 трыльёнаў мікраарганізмаў. У целе чалавека ўласных клетак у 1,3 раза менш, чым клетак мікробаў. Мікрабіём уплывае на страваванне, імунную сістэму, гаенне ран, прафілактыку хвароб, кагнітыўныя функцыі і нават эмоцыі ў чалавека. Значэнне мікрабіёма для нас настолькі вялікае, што навукоўцы называюць яго новым (а некаторыя — забытым) органам, амаль такім жа важным, як мозг ці сэрца. Без яго мы былі б няздольныя засвойваць вітаміны і пажыўныя рэчывы, зусім інакш паводзілі б сябе і непрадказальна рэагавалі б на інфекцыі.**
**Днямі ў Інстытуце генетыкі і цыталогіі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі ўрачыста адкрыўся Рэспубліканскі цэнтр вывучэння мікрабіёма.**

### КЕФІРНАЯ ВАКЦЫНА АД COVID-19

— Гэты напрамак стварае сёння цікавасць не толькі для медыцыны, але і для сельскай гаспадаркі, крыміналістыкі і іншых галін. Мікрабіёту чалавека складаюць 100 трыльёнаў сімбіятычных мікробаў. А колькасць генаў гэтых мікраарганізмаў у разы пераўзыходзіць колькасць генаў чалавека. 95 працэнтаў мікрабіёты знаходзяцца ў чалавека ў страўнікава-кішачным тракце, агульная паверхня якога мае памер двух тэнісных кортаў. А маса мікрабіёты можа дасягаць двух кілаграмаў, — тлумачыць **намеснік старшыні Прэзідыума НАН Беларусі Аляксандр КІЛЬЧЭЎСКІ**. — Лічыцца, што 90 працэнтаў захворванняў чалавека могуць быць тым ці іншым чынам звязаныя з кішэчнікам і «здароўем мікрабіёма», таму веданне асноўных механізмаў узаемадзеяння геному чалавека і яго мікрабіёма стварае вялікі патэнцыял для распрацоўкі персаналізаваных дыет і стварэння новых тэрапеўтычных агентаў. Цалкам магчыма, што далейшае вывучэнне мікрабіёма — разам з новымі генетычнымі тэхналогіямі — можа прывесці да сапраўднай рэвалюцыі ў медыцыне. Усё гэта вельмі актуальна, таму мы і вырашылі, што прыйшоў час сканцэнтраваць намаганні вучоных у Інстытуце генетыкі і цыталогіі, бо вывучаць мікрабіём без генетычных даследаванняў сёння проста немагчыма.

Адкрыццё цэнтра адбылося ў рамках правядзення Міжнароднай канферэнцыі «Жэбракаўскія чытанні — 2021», удзельнікам якой сталі вядомыя расійскія спецыялісты ў сферы вывучэння мікрабіёма з Інстытута эксперыментальнай медыцыны і Інстытута агульнай генетыкі РАН.

**Аляксандр СУВОРАЎ, загадчык аддзела малекулярнай мікрабіялогіі Інстытута эксперыментальнай медыцыны (г. Санкт-Пецярбург), доктар медыцынскіх навук, прафесар, член-карэспандэнт РАН**, у прыватнасці, паведаміў журналістам, што беларускія і расійскія вучоныя маюць намер супрацоўнічаць у сферы стварэння прабіятычных вакцын.

Навукоўцы Інстытута эксперыментальнай медыцыны працуюць цяпер над прабіятычнай вакцынай супраць каранавіруснай інфекцыі ў выглядзе кісламалочнага прадукту (так званай кефірнай). Ідэя выкарыстоўваць прабіётыкі для стварэння вакцын у інстытуце ўзнікла ўжо даўно.

— Гэтая распрацоўка звязаная з даследаваннямі, прысвечанымі мікраарганізмам. Мы ўжо больш за 20 гадоў займаемся карыснымі мікраарганізмамі, якія ўваходзяць у склад прабіётыкаў. Прыйшлі да высновы, што мікраарганізмы можна генетычна мадыфікаваць такім чынам, каб яны, апроч сваіх карысных уласцівасцяў, маглі б яшчэ і вырабляць антыгены патагенных мікраарганізмаў. Спажываючы такога кшталту кісламалочны прадукт, можна было б засцерагацца ад інфекцый. Пачалі гэтыя даследаванні на бактэрыяльных мадэлях і стварылі цэлы шэраг вакцынных кандыдатаў супраць узбуджальнікаў бактэрыяльных інфекцый, — расказаў прафесар. — А калі пачалася пандэмія COVID-19, адразу ж пераключыліся на стварэнне такога ж кшталту вакцыннага кандыдата супраць віруса SARS-CoV-2. Цяпер у нас ёсць два варыянты, якія мы інтэнсіўна даследуем. Яны праходзяць даклінічныя выпрабаванні. Калі ўсё атрымаецца, плануем стварыць такую ж вакцыну і для людзей.

І па колеры, і па смаку вакцына нагадвае ражанку. Зрэшты, яе можна зрабіць больш падобнай на кефір ці ёгурт. Робяць «ражанку» у двух варыянтах — на аснове каровінага малака і малака соевага. Каб і вегетарыянцы маглі «выпіць прышчэпку».

Новая вакцына ад Інстытута эксперыментальнай медыцыны адносіцца да вектарных. У якасці вектара выступае бактэрыя энтэракок, якая прысутнічае ў арганізме млекакормячых. Да яе падсаджваецца фрагмент каранавіруса (цэлага віруса няма, толькі ўчастак віруснага бялка), рэагуючы на які, імунная сістэма пачынае выпрацоўваць антыцелы. Прычым імунны адказ пачынаецца практычна адразу: у слізістай абалонцы рота і кішэчніка знаходзіцца вялікая колькасць клетак, якія адказваюць за распазнаванне чужароднага матэрыялу. У вакцыны-«ражанкі» нямала пераваг. Адсутнічае страх перад уколам, знаёмы дзецям і іх бацькам, ніякіх балючых адчуванняў. Танна, хутка, проста і карысна. Дастаткова выпіць вадкі прэпарат ці прыняць кішэчнараставаральную капсулу.

Вакцына не мае патрэбы ў асаблівых умовах захоўвання, для гэтага цалкам дастаткова халадзільніка. Яе лёгка «маштабаваць» на простых вытворчасцях: патрэбныя толькі ўмовы для ферментацыі малочнакіслых бактэрый.

**Апроч эканамічнага складніка і зручнасці выкарыстання, можна казаць яшчэ і пра тое, што, у адрозненне ад большасці вакцын, кефірная не выклікае ніякіх пабочных эфектаў. Магчымае толькі невялікае бурчанне ў жываце, як здараецца пры ўжыванні кісламалочных прадуктаў.**

Першымі выпілі «ражанку» ад COVID-19 інстытуцкія лабараторныя мышы. Ужо даказана, што шкоды яна ім не нанесла, а вось выпрацоўка антыцелаў ідзе добра. Цяпер праводзяцца выпрабаванні на хамяках. Чаму выбралі хамякоў? Таму што яны лёгка заражаюцца каранавірусам. Хамякам даюць вакцыну, адводзяць час для выпрацоўкі належнага імуннага адказу, пасля чаго заражаюць сапраўдным каранавірусам і глядзяць: захварэе — не захварэе. Калі захварэе, то наколькі сур'ёзна.



Алена МІХАЛЕНКА: «Трэба быць нацэленымі на актыўнае даўгалецце...»

Да канца года даклінічныя выпрабаванні «вадкай вакцыны» павінны быць завершаныя. Іх вынікі будуць старанна прааналізаваныя і перададзеныя ў Міністэрства аховы здароўя Расіі. І калі там будзе атрымана адабрэнне, вучоныя пачнуць клінічныя выпрабаванні на добраахвотніках.

### ЗАЛОГ ДОБРАЙ ВУЧОБЫ

— Вывучэнне мікрабіёты і мікрабіёма чалавека і іх сувязі з рознымі захворваннямі — гэта «мэйнстрым» сучаснай навукі, і наш інстытут быў адным з першых і ў Расіі, і ў свеце, хто заняўся гэтай праблематыкай. Вядома, мікрабіём цікавіць нас не толькі як індыкатар розных захворванняў. І не толькі ў плане стварэння прэпаратаў, накіраваных на карэкцыю мікрабіёма пры нейрадэгенератыўных, эндакрынных, анкалагічных і многіх іншых захворваннях, — падкрэслівае **загадчык лабараторыі генетыкі мікраарганізмаў і аддзела генетычных асноў біятэхналогіі Інстытута агульнай генетыкі імя М. Вавілава РАН, доктар біялагічных навук, прафесар Валерый ДАНІЛЕНКА**. — Напрыклад, для медыцыны надзвычай актуальная праблема множнай лекавай устойлівасці, якая зрабіла немагчымым ці вельмі праблематычным прымяненне антыбіётыкаў для лячэння розных інфекцыйных захворванняў. На працягу апошніх гадоў усе мы — генетыкі, мікрабіёлагі, хімікі — шукалі новыя крыніцы атрымання прэпаратаў для лячэння бактэрыяльных і вірусных захворванняў, уключаючы ковід.

Наш інстытут мае вялікі зачын у стварэнні фармабіётыкаў, якія можна выкарыстоўваць як для прадуктаў функцыянальнага харчавання, так і для розных фармпрэпаратаў. Зразумела, усіх цяпер у найбольшай ступені цікавіць COVID-19. Ужо цяпер відавочна, што ў найбліжэйшыя гады свет сутыкнецца з вялікай праблемай — мільёны людзей, што перахварэлі на ковід, у той ці іншай ступені будуць адчуваць наступствы гэтай інфекцыі. Яна ні для каго не праходзіць бясследна і адбіваецца на кагнітыўных функцыях чалавека, цягне парушэнні памяці, узмацненне дэпрэсіўных станаў, актывізацыю хвароб Паркінсона, Альцгеймера, кардыялагічных захворванняў. Спадзяёмся, што карэкцыя мікрабіёты дапаможа перашкодзіць распаўсюджванню ковіду, а на аснове мікрабіёты здаровых і ўстойлівых да ковіду людзей будуць ствараца прэпараты, якія дапамогуць аднаўляць здароўе мільёнаў тых, хто перахварэў.

Мікрабіём — гэта і наша здароўе, і наша магчымасць засцерагчыся ад ковіду, і крыніца вялікай колькасці карысных мікраарганізмаў для прадуктаў функцыянальнага харчавання.

У Інстытуце агульнай генетыкі таксама даследуецца феномен доўгажыхарства. Напрыклад, у Грузіі, Японіі, а раней і ў Гомельскай вобласці Беларусі было шмат доўгажыхароў. Трэба вывучаць іх мікрабіём, шукаць карысныя бактэрыі, якія дазваляюць людзям жыць 90-95 гадоў. Дарэчы, у дзяцей мікрабіём адказвае не толькі за імунную сістэму, але і за памяць і развіццё мозга. Для нас цікава, як функцыянальнае харчаванне можа ўплываць на паляпшэнне навучальнасці дзяцей, у якіх ёсць праблемы з вучобай. Напрыклад, у Расіі ёсць народы, якія жывуць на Крайняй Поўначы — для іх гэтая праблема актуальная. Трэба шукаць прычыны. І ёсць адукацыйны цэнтр «Сірыус» для адораных дзяцей. Цікава прасачыць адпаведную залежнасць і на іх прыкладзе.

### МІКРОБНЫЯ АДБІТКІ ПАЛЬЦАЎ

— Перад Рэспубліканскім цэнтрам мікрабіёма пастаўлены шэраг задач, — расказвае яго **кіраўнік, кандыдат біялагічных навук Алена МІХАЛЕНКА**. — Гэта вывучэнне мікрабіёма чалавека ў норме і пры паталогіі, распрацоўка метагеномных тэхналогій вызначэння мікрабіёма чалавека і глебы для вырашэння задач судовай экспертызы, аналіз мікрабіёты страўнікава-кішачнага тракта сельскагаспадарчых жывёлін, яе карэляцыі з паказчыкам здароўя, прадукцыйнасці і рацыёнам кармлення, вывучэнне мікрабіёма глеб для павышэння іх ураджайнасці і прадукцыйнасці раслін і іншыя.

Цэнтр задзейнічаны ў выкананні ўнікальнага праекта «Роля мікрабіёма ў рэалізацыі асаблівасцяў геному доўгажыхароў Беларусі». «Мы ўжо атрымалі пэўныя вынікі, але сказаць, што знайшлі мікраарганізм, які дазваляе жыць доўга і шчасліва, я пакуль не магу, — усміхаецца Алена Міхаленка. — Усё яшчэ знаходзіцца ў стадыі апрацоўкі інфармацыі. Але мы бачым, што мікрабіём у людзей старэйшага ўзросту адрозніваецца ад мікрабіёма ў маладых. І нам яшчэ трэба будзе высветліць, што неабходна рабіць, каб мы не проста жылі 90 гадоў, а жылі актыўна. Трэба быць нацэленымі менавіта на актыўнае даўгалецце. Спадзяёмся выпрацаваць пэўныя рэкамендацыі, каб чалавек мог скарэктаваць свой спосаб жыцця і прыём фармпрэпаратаў...»

Нядаўна супрацоўнікі Рэспубліканскага цэнтра мікрабіёма былі прыцягнутыя для аказання кансультацыі ў выпадку цяжкага працякання захворвання неўстаноўленай этыялогіі. Размова ішла пра 16-гадовую дзяўчыну, якой пагражала ампутацыя канечнасці. Упершыню ў Беларусі было выканана паралельнае вывучэнне поўнага экзому пацыенткі і мікрабіёма. У дадзены момант такі аналіз магчымы толькі ў Інстытуце генетыкі і цыталогіі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. Праведзенае даследаванне дазволіла скарэктаваць хірургічнае і медыкаментознае лячэнне і дасягнуць поспеху.

«А ці ведаеце вы, што ў кожнага чалавека ўнікальныя не толькі адбіткі яго пальцаў, але і супольнасць мікраарганізмаў на яго руках? Нават пасля мыцця рук наш мікрабіём аднаўляецца ўжо праз дзве гадзіны, — кажа Алена Міхаленка. — У Вялікабрытаніі праводзіліся даследаванні сярод студэнтаў, якія жылі ў кампусе на чатырох паверхах. Даследчыкі з высокай ступенню верагоднасці змаглі вызначыць, на якім паверсе жыве той ці іншы студэнт. У крыміналістыцы гэтыя звесткі могуць быць карысныя. Мікрабіём глебы — таксама выдатная лакмусавая паперка».

Дарэчы, у сусветнай літаратуры назапашаны звесткі аб залежнасці складу мікрабіёма ад полу і ўзросту, асаблівасцяў клімату і геаграфічнага размяшчэння, харчавання, прафесіі, спосабу жыцця і асаблівасцяў асабістай гігіены. Вядома, што колькасць мікраарганізмаў на скуры ў здаровага чалавека пастаянна мяняецца і залежыць ад сезону, дасягаючы максімуму зімой і мінімальных значэнняў — летам. Вывучаны нават склад мікрафлоры спартыўнага інвентару, прадметаў бытавога спажывання і г. д. У судовай медыцыне апісана методыка метагеномнага аналізу мікрабіёты паверхні мабільных тэлефонаў, вынікі якога могуць быць доказам прыналежнасці мабільнага тэлефона канкрэтнай асобе.

Мікробы, што жывуць на нашай левай руцэ, адрозніваюцца ад тых, што жывуць на правай. Вы можаце церці рукі, пляскаць у далоні і дакранацца дзвюма рукамі да адных і тых жа паверхняў — на кожнай усё адно развіваецца асобная мікробная супольнасць. Прычым яна моцна адрозніваецца ад аналагічных супольнасцяў іншых людзей (па разнастайнасці відаў — у сярэднім на 85 %), што азначае — у кожнага з нас, апроч звычайных, ёсць яшчэ і ўнікальныя мікробныя адбіткі пальцаў...

**Надзея НІКАЛАЕВА, фота аўтара.**

# ШЛЯХАМ «ЖАЛЕЗНАГА



Лідараў Беларусі і Кітая звязваюць не толькі рабочыя адносіны, а і шчырае сяброўства.

## Усепагоднае партнёрства

Гэты год стаў на самай справе знакавым у прадукцыйным фармаце беларуска-кітайскага супрацоўніцтва, якое дынамічна развіваецца на працягу трох дзесяцігоддзяў. КНР займае выключнае месца ў знешняй палітыцы Беларусі, гэта наш асноўны стратэгічны партнёр у азіяцкім рэгіёне. Такім чынам акрэсліў узровень узаемадзеяння дзвюх дзяржаў намеснік міністра замежных спраў Беларусі Мікалай Барысевіч на цырымоніі адкрыцця Года рэгіёнаў Беларусі і Кітая. У межах гэтага глабальнага міждзяржаўнага праекта ў 2021—2022 гадах намечана правесці дзясяткі важных мерапрыемстваў. Міжрэгіянальнае супрацоўніцтва стала новым пунктам росту ў адносінах Беларусі і Кітая, падкрэсліў у эксклюзіўным інтэрв'ю «Звяздзе» Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Кітайскай Народнай Рэспублікі ў Рэспубліцы Беларусь Се Сяаюн.

Як адзначыў кіраўнік дыпламатычнай місіі, правядзенне Года рэгіёнаў Беларусі і Кітая з'яўляецца важнай дамоўленасцю, дасягнутай Прэзідэнтам Беларусі Аляксандрам Лукашэнкам і Старшынёй КНР Сі Цзіньпінам падчас тэлефоннай размовы сёлета ў студзені. Кіраўнікі дзяржаў абмяняліся віншаваннямі з нагоды чарговай гадавіны ўстанаўлення дыпламатычных адносін паміж Беларуссю і Кітаем (пад знакам гэтай даты і прайшла размова), падрабязна абмеркавалі розныя сферы супрацоўніцтва, паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара. Аляксандр Лукашэнка падзякаваў старшыні КНР за падтрымку Беларусі на міжнароднай арэне. Як адзначыў у дадзеным кантэксце кітайскі лідар, толькі народ можа вырашаць і вызначаць будучыню сваёй краіны. У цэлым жа стратэгічныя партнёры Беларусь і Кітай будуць разам супрацьстаяць знешнім пагрозам. Беларусь таксама працягне аказваць Кітаю падтрымку па ўсіх ключавых пытаннях.

**КНР другі пасля Расіі знешнегандлёвы партнёр Беларусі з гадавым абаротам $5,4 млрд (такога ўзроўню дасягнулі летась, пры гэтым тэмп росту склаў 102,4 працэнта). Новы драйвер экспарту — пастаўкі сельгаспрадукцыі.**

Адметна, што першым з лідараў замежных дзяржаў Аляксандра Лукашэнку з перамогай на прэзідэнцкіх выбарах у жніўні 2020 года павіншаваў менавіта Старшыня КНР Сі Цзіньпін. Паводле яго слоў, Беларусь і Кітай — «жалезныя браты і ўсепагодныя партнёры». «Я надаю вялікае значэнне развіццю кітайска-беларускіх адносін і шаную добрыя рабочыя адносіны і асабістую дружбу з Вамі», — адзначыў у пасланні Старшыня КНР.

## Анлайн-пляцоўкі і транзіт

Прэзідэнт Беларусі яскрава акрэсліў стратэгічныя кірункі ўзаемадзеяння з Паднябеснай падчас свайго выступлення на прадстаўнічым Міжнародным форуме па гандлі паслугамі CIFTIS, які прайшоў у верасні ў Пекіне. Гэты форум — найбуйнейшая ў Кітаі экспазіцыя ў стратэгічнай галіне. CIFTIS праходзіць у Пекіне з 2012 года і з'яўляецца пляцоўкай для абмену вопытам аказання паслуг у сферах фінансаў, транспарту, лагістыкі, інфармацыйных тэхналогій, электроннага гандлю, аховы здароўя, навакольнага асяроддзя, турызму і іншых. Гэта адна з трох асноўных кірмашовых пляцовак Кітая разам з шанхайскім «Імпарт ЭКСПА» і Кантонскім кірмашом у Гуанчжоў. Сёлета ў форуме ўзяло ўдзел больш за 10 тысяч прадпрыемстваў з 153 краін і рэгіёнаў свету. Мерапрыемства стала платформай для дэманстрацыі, абменаў і супрацоўніцтва ў рамках развіцця гандлю паслугамі паміж Кітаем і краінамі Еўразіі.

«За гады трывалага сяброўства Беларусі і Кітая мы неаднаразова пераконваліся ў паслядоўнасці палітыкі Пекіна, які аб'яднаў мноства дзяржаў у рамках ініцыятывы «Пояс і шлях» на ўмовах справядлівага, раўнапраўнага, узаемавыгаднага супрацоўніцтва. Больш за тое, перажытыя ўзрушэнні, абумоўленыя пандэміяй і іншымі глабальнымі выклікамі, толькі ўмацавалі яго», — заявіў у сваім выступленні перад удзельнікамі Глабальнага саміту беларускі лідар. Ён падкрэсліў, што закрыццё граніц, зніжэнне турыстычнай актыўнасці, разрыў лагістычных ланцужкоў і рост пратэкцыянізму, каласальны ціск на сістэму аховы здароўя, адмена міжнародных культурных мерапрыемстваў сталі беспрэцэдэнтным выпрабаваннем для рынку паслуг. У той жа час, адзначыў Аляксандр Лукашэнка, крызіс стымуляваў бум лічбавых тэхналогій і паслужыў своеасаблівым імпульсам для якаснай перазагрузкі традыцыйнай сферы паслуг. «У гэтым кантэксце ўражвае перадавы вопыт Кітая па развіцці і ўкараненні паслуг дыстанцыйнай адукацыі, анлайн-дыягностыкі і лячэння, прымяненні лічбавых тэхналогій у галіне турызму», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

«Беларусь удзяляе асаблівую ўвагу нарошчванню экспарту і імпарту паслуг. Разлічваем на пашырэнне супрацоўніцтва з Кітаем у гэтай сферы як адным з ключавых партнёраў нашай краіны. У якасці прыярытэтнага напрамку бачым сумесную работу дзяржаў па далейшай лібералізацыі гандлю паслугамі, устараненні бар'ераў, прыцягненні інвестыцый. У апошнія гады мы сталі сведкамі актыўнага росту глабальнай электроннай камерцыі, у тым ліку трансгранічнай, аб'ёмы якой прырастаюць на 50 працэнтаў штогод. Гэты інструмент стаў эфектыўным рэсурсам для аднаўлення эканамічнага росту. Беларусь бачыць вялікія перспектывы ў выхадзе на кітайскія анлайн-пляцоўкі для прасоўвання не толькі тавараў, але і паслуг у сферах адукацыі, турызму, медыцыны», — заявіў Прэзідэнт Беларусі.

Аляксандр Лукашэнка канстатаваў, што каранавірус нанёс каласальную шкоду турыстычнай галіне. «Мы павінны актывізаваць распрацоўку мер для далейшага павелічэння аб'ёму аказання турыстычных паслуг», — упэўнены ён. Кіраўнік дзяржавы нагадаў, што свет перажывае і «лагістычны калапс». «Дзякуючы ўнікальнаму геаграфічнаму становішчу Беларусі наша транспартная інфраструктура карыстаецца актыўным попытам у якасці надзейнага транзітнага калідора «Пояса і шляху». З 2014 да 2020 года нам удалося ў 14 разоў павялічыць аб'ёмы чыгуначных кантэйнерных перавозак па маршруце Кітай — Еўропа — Кітай, якія накіроўваюцца праз нашу краіну. Рэспубліка Беларусь і ў далейшым будзе прымаць усе неабходныя меры для забеспячэння бесперабойнага руху чыгуначных саставаў па гэтым маршруце», — запэўніў беларускі лідар. Ён падкрэсліў, што Беларусь прадоўжыць уносіць свой уклад у больш хуткае аднаўленне сусветнай эканомікі і развіваць разнапланавае і ўзаемавыгаднае міжнароднае супрацоўніцтва ў сферы паслуг.

Старшыня КНР Сі Цзіньпін у сваю чаргу назваў мір, развіццё і ўзаемавыгаднае супрацоўніцтва «залатымі ключамі» да вырашэння праблем у міжнароднай эканоміцы, гандлі і інвестыцыях. Ён адзначыў, што Кітай гатовы падзяліцца сваімі дасягненнямі ў галіне тэхналагічнага развіцця са светам. На думку Сі Цзіньпіна, краіны павінны імкнуцца працаваць сумесна для стварэння лепшай будучыні.

## Асаблівае месца

Беларусь і Кітай паслядоўна падтрымліваюць адзін аднаго на міжнародных пляцоўках. Яшчэ адно сведчанне таму — нядаўняе пасяджэнне Вышэйшага Еўразійскага эканамічнага савета. Падчас яго правядзення Прэзідэнт Беларусі выказаўся па ключавых пытаннях у парадку дня інтэграцыйнага аб'яднання. У адпаведнасці з зацверджанымі Асноўнымі напрамкамі міжнароднай дзейнасці ЕАЭС на 2022 год Аляксандр Лукашэнка прапанаваў засяродзіцца на некалькіх ключавых пытаннях. Паводле яго слоў, сумесная работа на знешнім контуры і дзейнасць Еўразійскай эканамічнай камісіі павінны быць арыентаваны перш за ўсё на вырашэнне практычных задач развіцця экспарту тавараў і паслуг. «Кітай тут займае асаблівае месца, — заўважыў беларускі лідар. — Лічу неабходным акцэнтаваць увагу на ўзаемадзеянні з гэтай краінай у рамках спалучэння планаў развіцця ЕАЭС, ініцыятывы «Адзін пояс, адзін шлях» і Пагаднення аб гандлёва-эканамічным супрацоўніцтве 2018 года».

Раней прэм'ер-міністр Беларусі Раман Галоўчанка абазначыў перспектывы ўзаемадзеяння з Шанхайскай арганізацыяй супрацоўніцтва падчас пасяджэння Савета кіраўнікоў урадаў дзяржаў — членаў ШАС. Ён звярнуў увагу на неабходнасць эфектыўнага выкарыстання транзітнага патэнцыялу ШАС для постковіднага аднаўлення эканомік, умацавання гандлёва-эканамічных сувязяў на прасторы арганізацыі, доступу на рынкі іншых рэгіёнаў. Паводле яго слоў, асаблівую ўстойлівасць да абмежаванняў ва ўмовах пандэміі прадэманстравалі чыгуначныя перавозкі. Транзітам па тэрыторыі Беларусі ажыццяўляецца больш за 90 працэнтаў усіх чыгуначных перавозак з Кітая ў Еўропу і ў зваротным напрамку. «Для нарошчвання патэнцыялу і пашырэння магчымасцяў чыгуначных перавозак мы сумесна з замежнымі партнёрамі абнаўляем адпаведную інфраструктуру, ствараем сучасныя лагістычныя цэнтры, робячы транспарціроўку грузаў праз Беларусь прывабнай і эфектыўнай. Беларусь адной з першых падпісала пагадненне паміж урадамі дзяржаў — членаў ШАС аб стварэнні спрыяльных умоў для міжнародных аўтамабільных перавозак. Мы гатовы ўнесці свой уклад у практычную рэалізацыю ініцыятывы Новага еўразійскага сухапутнага моста, стварэнне сучаснага наземнага транспартнага калідора з Кітая ў Еўропу праз тэрыторыю дзяржаў Цэнтральнай Азіі, Расію і Беларусь. Гэта дасць магчымасць забяспечыць высокую хуткасць дастаўкі і бяспеку грузаў, а таксама эфектыўна пераразмеркаваць лагістычныя патокі», — падкрэсліў прэм'ер-міністр.

## Фактар рэгіёнаў

Усё больш важным складнікам кітайска-беларускіх адносін становіцца міжрэгіянальнае супрацоўніцтва. Па меры паглыблення адносін усё больш і больш кітайскіх правінцый і гарадоў накіроўваюць свае дэлегацыі ў Беларусь. Зараз устаноўлены 33 пары пабрацімскіх адносін па лініі гарадоў і абласцей. Як паведаміў Се Сяаюн, падчас дзяржаўнага візіту Старшыні КНР у Беларусь у 2015 годзе ў Мінску паспяхова адбыўся Кітайска-Беларускі міжрэгіянальны бізнес-форум. Рэгіёны і прадпрыемствы дзвюх краін скарысталіся гэтай магчымасцю і падпісалі 25 дакументаў аб супрацоўніцтве на агульную суму амаль сем мільярдаў долараў. Роля міжрэгіянальнага супрацоўніцтва ў вывучэнні новых мадэляў і новых праектаў супрацоўніцтва паміж дзвюма краінамі расце з кожным днём. Год рэгіёнаў Кітая і Беларусі надасць новы імпульс паглыбленню ўзаемадзеяння паміж дзвюма краінамі.

Як заўважыў БелТА першы намеснік прэм'ер-міністра Беларусі, сустаршыня Беларуска-кітайскага міжурадавага камітэта па супрацоўніцтве Мікалай Снапкоў, «мы планамерна пераходзім ад колькаснага напаўнення міжрэгіянальнага супрацоўніцтва да павышэння змястоўнай часткі гэтага ўзаемадзеяння, найперш эканамічнага і гуманітарнага. Такім чынам,




Фота БелТА.

Адзін з найважнейшых сумесных праектаў — Кітайска-беларускі індустрыяльны парк «Вялікі камень».

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

# БРАТЭРСТВА»

рашэнне кіраўнікоў двух дзяржаў правесці тэматычныя гады міжрэгіянальнага супрацоўніцтва — заканамерны і абгрунтаваны крок».

У КНР налічваецца 34 адміністрацыйныя адзінкі так званага першага ўзроўню. Кожная з абласцей Беларусі і сталіца ўстанавілі пабрацімскія сувязі як мінімум з дзвюма і больш правінцыямі Кітая. Напрыклад, Магілёўская вобласць — пабрацім рэгіёнаў КНР з сукупным насельніцтвам больш як 230 мільёнаў чалавек і ВУП больш за 1,8 трыльёна долараў. У Брэсцкай вобласці партнёрскія адносіны з рэгіёнамі з насельніцтвам больш як 200 млн чалавек і ВУП больш як $1,4 трлн.

**Адметна, што першым з лідараў замежных дзяржаў Аляксандра Лукашэнку з перамогай на прэзідэнцкіх выбарах у жніўні 2020 года павіншаваў менавіта старшыня КНР Сі Цзіньпін. Паводле яго слоў, Беларусь і Кітай — «жалезныя браты і ўсепагодныя партнёры». «Я надаю вялікае значэнне развіццю кітайска-беларускіх адносін і шаную добрыя рабочыя адносіны і асабістую дружбу з Вамі», — адзначыў у пасланні старшыня КНР.**

«Гэта патэнцыйны рынак для нашага экспарту, доступ на які будзе значна спрошчаны падчас Года рэгіёнаў, — лічыць Мікалай Снапкоў. — Кожная правінцыя, горад па-свойму ўнікальныя, а мясцовыя ўрады адкрыты для партнёрства і ўзаемаабменаў. Чаго чакаць па выніках? Адказ відавочны — паглыблення і разнапланавага пашырэння гандлёва-эканамічных, інвестыцыйных, культурных, турыстычных і іншых сувязяў паміж нашымі краінамі. Міжрэгіянальнае супрацоўніцтва — лакаматыў нашых адносін, які вядзе за сабой вялікі патэнцыял сумесных праектаў і ініцыятыў, ведаў і вопыту».

## Ад экспарту да фільмаў

Для Беларусі заўсёды важна было супрацоўніцтва з Кітайскай Народнай Рэспублікай. «Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка з 1990-х гадоў глыбока адчуў моц і паступальнасць развіцця Кітая, — адзначыў першы віцэ-прэм'ер. — Асаблівы шлях развіцця Кітая падтрымлівае наш уласны шлях развіцця. Мабыць, менавіта дзве краіны ў свеце на чале эканамічнай палітыкі ставяць рост дабрабыту грамадзян. У нас аднолькавыя прынцыпы і ідэалогія развіцця. І нам ёсць на каго раўняцца і на чыю дапамогу разлічваць». Мікалай Снапкоў падкрэсліў, што Беларусь і Кітай узаемна падтрымлівалі адна адну ў цяжкі перыяд барацьбы з COVID-19, і гэта маштабная і сяброўская дапамога. «Падтрымка ёсць, і яна нарошчваецца ў сітуацыі палітычнага і эканамічнага ціску з боку краін, не здольных успрымаць адрозныя ад іх «стандартаў» падыходы да грамадскіх інстытутаў», — адзначыў першы віцэ-прэм'ер.

Ён звярнуў увагу на беларуска-кітайскае супрацоўніцтва, якое актыўна развіваецца, у тым ліку міжрэгіянальнае, што знайшло адлюстраванне і ў Дырэктыве № 9. «Сяброўства і ўсебаковае ўзаемадзеянне паміж абласцямі Беларусі і правінцыямі КНР, паміж гарадамі ствараюць падмурак сумеснага развіцця нашых краін, — заўважыў Мікалай Снапкоў. — Дырэктыва мае прыкладны характар і вызначае канкрэтныя задачы па нарошчванні і паглыбленні супрацоўніцтва ва ўсіх сферах. Абласцям пастаўлены мэтавы арыенцір — прыцягненне да канца пяцігодкі па 150 мільёнаў долараў прамых інвестыцый ад кітайскіх інвестараў».

Дырэктыва № 9 накіравана на далейшае паглыбленне стратэгічнага партнёрства Беларусі з Кітаем па шырокім спектры напрамкаў у 2021—2025 гадах. Прыярытэтнымі задачамі на найбліжэйшую перспектыву вызначаны ўмацаванне супрацоўніцтва ў палітычнай сферы, захаванне і прымнажэнне каштоўнасцяў дружбы і ўзаемнай падтрымкі, нарошчванне гандлёва-эканамічнага, фінансавага, інвестыцыйнага ўзаемадзеяння, рэалізацыя ініцыятывы «Пояс і шлях». Пры гэтым прадугледжваецца фарміраванне спецыялізацыі ў найбуйнейшым транснацыянальным праекце. Сярод важных задач таксама — пашырэнне міжрэгіянальных сувязяў, развіццё супрацоўніцтва ў ваеннай і ваенна-тэхнічнай галінах, у сферы лічбавай эканомікі і інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій, умацаванне навукова-тэхнічнага ўзаемадзеяння, развіццё адносін у гуманітарнай сферы. У мэтах выканання названых задач органам дзяржаўнага кіравання і іншым уключаным у супрацоўніцтва з КНР суб'ектам эканамічнай дзейнасці даручаецца забяспечыць рэалізацыю каля пяцісотні канкрэтных практычных мер. Эфектыўнае выкананне пастаўленых мэт будзе садзейнічаць вывядзенню двухбаковых адносін на якасна новы ўзровень.

За кошт рэсурсаў Паднябеснай у нашай краіне рэалізаваны 24 праекты амаль на $4,5 млрд. Працягваецца работа па іншых буйных праектах. Сярод самых значных — Беларуская нацыянальная біятэхналагічная карпарацыя, завод «БЕЛДЖЫ», аб'екты электраэнергетыкі. Адзін з найважнейшых сумесных праектаў — Кітайска-беларускі індустрыяльны парк «Вялікі камень», які старшыня КНР па праве назваў жамчужынай Шаўковага шляху і ахарактарызаваў як узорны. «Парк ствараўся для рэалізацыі праектаў пераважна пятага і шостага ўкладаў, самых найноўшых распрацовак і інавацый, і ён выконвае сваю місію», — лічыць намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Дзмітрый Крутой. «Вялікі камень» — не проста свабодная эканамічная зона або лагістычны тэрмінал. «Гэта ў першую чаргу адна з ключавых платформаў Новага шаўковага шляху і адзіная ў нашым рэгіёне, — заўважыў у сваім выступленні на VI Усебеларускім народным сходзе кіраўнік адміністрацыі парка «Вялікі камень» Аляксандр Ярашэнка. — Яна з'яўляецца элементам глабальнага пазіцыянавання Беларусі і пунктам апоры для Кітая, як тэрыторыя паскоранага эканамічнага росту і тэхналагічнага развіцця, — адзначыў ён. — Палітычныя дамоўленасці і асабістая ўвага лідараў нашых краін да развіцця індустрыяльнага парка дазволілі яму стаць найлепшай асаблівай эканамічнай зонай «Пояса і шляху». Менавіта так у 2020 годзе яго назвалі эксперты Financial Times». Аляксандр Ярашэнка падкрэсліў, што менавіта такія праекты складуць аснову эканомікі будучай Беларусі. «Мы высока цэнім удзел у іх Кітая. Як часта гавораць нашы партнёры: магчыма ўсё, на немагчымае проста патрабуецца больш часу», — дадаў ён. Мяркуецца, што «Вялікі камень» да 2025 года прыцягне мінімум пяць кампаній з аб'ёмам інвестыцый больш за $50 млн.



Фота БелТА.

Кампанія «БЕЛДЖЫ» да канца года плануе вырабіць 30 тысяч аўтамабіляў.



Фота БелТА.

Беларуская нацыянальная біятэхналагічная карпарацыя паспяхова ўкараняе найноўшыя тэхналогіі ў аграпрамысловы комплекс.

КНР другі пасля Расіі знешнегандлёвы партнёр Беларусі з гадавым абаротам $5,4 млрд (такога ўзроўню дасягнулі летась, пры гэтым тэмп росту склаў 102,4 працэнта). Новы драйвер экспарту — пастаўкі сельгаспрадукцыі, заявіў падчас пасяджэння міжурадавага камітэта Мікалай Снапкоў. Стаўка сябе апраўдала — беларускай прадукцыі ўдалося ў кароткія тэрміны заваяваць рынак Кітая дзякуючы якасці і добрым адносінам лідараў дзвюх краін, заўважыў намеснік міністра сельскай гаспадаркі і харчавання Беларусі Аляксей Багданаў. Ён паведаміў, што з пачатку бягучага года ў КНР беларускіх прадуктаў харчавання пастаўлена на 36 працэнтаў больш, чым за такі ж час летась. Аб'ём пастаўак ужо перавысіў $250 млн, столькі ж было за ўвесь мінулы год. Як адзначыў міністр сельскай гаспадаркі і харчавання Іван Крупко, Беларусь разлічвае нарасціць экспарт прадуктаў харчавання ў Кітай да $1 млрд па выніках пяцігодкі.

Першы віцэ-прэм'ер перакананы, што Дырэктыва прынясе пэўныя вынікі па ўсіх напрамках супрацоўніцтва: ад дасягнення экспарту да $2 млрд да 2025 года да стварэння сумесных мастацкіх фільмаў. Яе прыняцце адбываецца ў вельмі важны гістарычны момант, заўважыў БелТА Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Рэспублікі Беларусь у Кітайскай Народнай Рэспубліцы Юрый Сянько. «Нашы краіны — шчырыя, «жалезныя», як мы гаворым, браты, якія падтрымліваюць адзін аднаго ў цяжкія часы, — зазначыў дыпламат. — Дырэктыва № — комплексны, глыбокі па сваім змесце дакумент, які распрацоўваўся даволі працяглы час з удзелам вялікай колькасці беларускіх органаў дзяржаўнага кіравання, суб'ектаў эканамічнай дзейнасці, вучоных і экспертаў. У ім сабраны канкрэтныя, прарыўныя напрамкі двухбаковага ўзаемадзеяння, якія, перакананы, выведуць беларуска-кітайскія адносіны на якасна новы ўзровень».

## Залаты этап

Юрый Сянько адзначыў і такі важны момант: прыняцце дакумента адбылося напярэдадні 30-й гадавіны ўсталявання дыпламатычных адносін Беларусі і Кітая, якая будзе святкавацца налета, 20 студзеня. «За гэты невялікі, але насычаны рознымі падзеямі перыяд нашы адносіны вытрымалі ўсе выпрабаванні, заўсёды заставаліся дынамічнымі і рэзультатыўнымі. У іх аснове — шчырасць і дружба народаў дзвюх краін, поўнае супадзенне поглядаў па ўсіх пытаннях міжнароднага парадку дня», — рэзюмаваў кіраўнік беларускай дыпламатычнай місіі.

Кітай — адна з першых краін, якія прызналі незалежнасць Беларусі і ўстанавілі з ёй дыпламатычныя адносіны. Як перакананы Се Сяаюн, далейшае ўмацаванне супрацоўніцтва ў якасці ўсебаковых стратэгічных партнёраў зможа не толькі эфектыўна абараніць агульныя інтарэсы абодвух бакоў, але і аб'яднаць намаганні для абароны міжнароднай справядлівасці. «Узровень кітайска-беларускіх адносін тройчы павышаўся: з «сяброўскіх адносін супрацоўніцтва» да «адносін усебаковага стратэгічнага партнёрства» і ў выніку да «адносін давернага ўсебаковага стратэгічнага партнёрства і ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва», — заўважыў кітайскі дыпламат. — Абодва бакі стварылі дзейсныя механізмы ўзаемадзеяння, у тым ліку Кітайска-Беларускі міжурадавы камітэт па супрацоўніцтве, цесна ўзаемадзейнічаюць у міжнародных і рэгіянальных справах, абараняюць агульныя інтарэсы дзвюх краін і ўнеслі важны ўклад ва ўмацаванне рэгіянальнага і глабальнага міру і бяспекі».

Як лічыць Се Сяаюн, прычына, па якой за 30 гадоў з моманту ўсталявання дыпламатычных адносін кітайска-беларускія адносіны набылі такую моцную жыццяздольнасць, у тым, што іх развіццё адпавядае фундаментальным інтарэсам двух народаў і доўгатэрміновым патрэбам Кітая і Беларусі ў стабільнасці і развіцці, а таксама прынесла адчувальныя выгады абодвум бакам. «За 30 гадоў нашы краіны сталі насамрэч блізкімі братамі, добрымі партнёрамі, супрацоўніцтва якіх прыносіць узаемную выгаду, а таксама сталі добрымі сябрамі, якія часта бываюць адзін у аднаго ў гасцях, — адзначыў кітайскі дыпламат. — У нас ёсць усе падставы меркаваць, што народы Кітая і Беларусі будуць ісці поплеч і адкрыюць наступны залаты этап двухбаковых адносін».

Дырэктывай № 9 мяркуецца павышэнне статусу беларуска-кітайскіх адносін да ўзроўню «жалезнага братэрства», узорнага ўсебаковага стратэгічнага супрацоўніцтва і ўсепагоднага партнёрства. «Фактычна на новы этап мы ўжо выйшлі. Аб гэтым сведчаць абсалютна ўсе паказчыкі нашага ўзаемадзеяння ў палітыцы, эканоміцы і гуманітарнай сферы, — адзначыў Мікалай Снапкоў. — Рашэнне па замацаванні дэ юрэ новага ўзроўню адносін — за Прэзідэнтам Беларусі і Старшынёй КНР».

Зразумела, мы не маглі застацца ўбаку і актыўна развіваем і пашыраем спрацоўніцтва з кітайскімі калегамі. У верасні 2015-га ў рамках Форуму медыясупрацоўніцтва «Адзін пояс і адзін шлях», у якім бралі ўдзел 170 прадстаўнікоў СМІ з 60 краін усіх кантынентаў, «Звязда» падпісала Мемарандум аб узаемаразуменні і супрацоўніцтве з адным з вядучых у сусветнай медыяпрасторы і самым уплывовым выданнем у Кітаі — газетай «Жэньмінь жыбаа». На партале zviazda.by ў кастрычніку 2015 года быў запушчаны глабальны праект «Весткі з Кітая», кантэнт якога пераважна фарміруецца матэрыяламі ўплывовых кітайскіх выданняў і інфармагенцтваў, у першую чаргу — «Жэньмінь жыбаа». У сваю чаргу публікацыі «Звязды» актыўна выкарыстоўваліся пры фарміраванні навінавай стужкі на інтэрнэт-партале «Жэньмінь жыбаа» анлайн», дзе таксама з'явіўся тэматычны банер. Цікава, што ў музеі «Жэньмінь жыбаа» «звяздоўскаму» праекту адведзена пачэснае месца. Наша выданне ўвайшло ў склад глабальнай інфармацыйнай сеткі «Адзін пояс, адзін шлях» (The Belt and Road News Network — BRNN). Як адзначылі ў дэпартаменце знешніх сувязяў газеты «Жэньмінь жыбаа», супрацоўніцтва паміж выданнямі будзе пашырацца, у тым ліку за кошт магчымасцяў BRNN. У добры шлях!

**Мікалай ЛІТВІНАЎ.**

## ИЗВЕЩЕНИЕ
## о проведении 18 января 2022 года торгов с условиями по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Банк Дабрабыт»

| Сведения о предмете торгов (продаваемом имуществе) | | |
|---|---|---|
| Наименование, местонахождение и характеристики продаваемого имущества | Начальная цена, бел. руб. (с учетом НДС) | Размер задатка, бел. руб. |
| Изолированное помещение финансового назначения (назначение – помещение финансового назначения) с инв. номером в ЕГРНИ 700/D-89863 общей площадью 120,5 кв. м, расположенное по адресу: Могилевская обл., г. Могилев, ул. Пионерская, д. 12/25, и установленные в нем системы кондиционирования: сплит-система LS H09KKA2A/LU-H09KKA2A с инв. номером 7930, сплит-система кассетного типа LS-HE24BMA2/LU-HE24 с инв. номером 8601 | 267 297,24 | 26 700,00 |

**Продавец имущества:** ОАО «Банк Дабрабыт», ул. Коммунистическая, 49, пом. 1, 220002, г. Минск.

**Организатор торгов:** государственное предприятие «МГЦН», ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск.

**Условия торгов**: победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 1 процента от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов;

Торги проводятся в соответствии со статьями 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения торгов по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Банк Дабрабыт», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, заключившие с организатором торгов соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, внесшие задаток, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

*Задаток перечисляется на расчетный счет государственного предприятия «МГЦН» № BY15 BLBB 3012 0190 3985 8300 1001 в ЦБУ № 527 ОАО «Белинвестбанк» г. Минск, БИК BLBBBY2X, получатель – государственное предприятие «МГЦН», УНП 190398583, в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе.*

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается после предъявления копии платежных документов о перечислении суммы вознаграждения и подписывается в течение 10 рабочих дней со дня проведения торгов. Расходы, связанные с государственной регистрацией договора купли-продажи и основанных на нем прав, оплачиваются победителем торгов (покупателем).

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в срок не более 25 рабочих дней с даты заключения договора купли-продажи изолированного помещения с установленными в нем системами кондиционирования.

Торги проводятся **18 января 2022 года в 15.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 7 (зал аукционов). Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются **с 15.12.2021 по 14.01.2022** включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.30) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

**Телефоны для справок:** (017) 365 48 36 (государственное предприятие «МГЦН»); (017) 239-19-26 (ОАО «Банк Дабрабыт»).

Дополнительная информация размещена на сайте **www.mgcn.by** в разделе «Недвижимость в собственность».

---

*Да ўвагі акцыянераў*
*Адкрытага акцыянернага таварыства «Сталічны праспект»!*

**28 снежня 2021 года**
**адбудзецца пазачарговы агульны сход акцыянераў**

## ААТ «Сталічны праспект»
**(г. Жабінка, вул. Камарова, 6, каб. 3)**

**Парадак дня:**

1. Аб павелічэнні Статутнага фонда ААТ «Сталічны праспект» за кошт уласных сродкаў шляхам павелічэння намінальнай вартасці кожнай акцыі.
2. Аб зацвярджэнні змяненняў у Статут Таварыства.

Форма правядзення Сходу – змешаная.

Месца правядзення Сходу – г. Жабінка, паселак Цукровага завода, клуб ААТ «Жабінкаўскі цукровы завод».

Пачатак работы сходу: 28 снежня 2021 года ў 12 гадзін 30 хвілін.

Рэгістрацыя асоб, якія маюць права на ўдзел у Сходзе, ажыццяўляецца ў дзень правядзення Сходу па месцы правядзення Сходу пры ўмове прад'яўлення акцыянерамі (іх прадстаўнікамі) дакументаў, якія пацвярджаюць іх паўнамоцтвы (акцыянеру – пашпарт, прадстаўніку акцыянера – пашпарт і даверанасць, завераная у парадку, устаноўленым заканадаўствам).

Час пачатку рэгістрацыі: 12 гадзін 00 хвілін.

Час завяршэння рэгістрацыі: 12 гадзін 30 хвілін.

З матэрыяламі Сходу можна азнаеміцца з 15 снежня 2021 года па 28 снежня 2021 года ў працоўныя дні з 9 да 16 гадзін па адрасе: г. Жабінка, вул. Камарова, 6, каб. 3, а ў дзень правядзення Сходу – па месцы правядзення Сходу.

УНП 290984478

---

Центр Промышленной Оценки

• ОРГАНИЗАЦИЯ АУКЦИОНОВ
• ОЦЕНКА ВСЕХ ВИДОВ ИМУЩЕСТВА

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | **ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703** |
| **Продавец** | **ОАО «БЕЛХИМ», Минская обл., Дзержинский р-н, Фанипольский, с/с 19** |
| **Оператор ЭТП** | **ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703. Адрес ЭТП: www.ipmtorgi.by.** |

**Предмет электронных торгов**

| Лот № | Наименование | Начальная цена с НДС 20 % |
|---|---|---|
| 1 | **Административно-хозяйственное здание с пристройкой** (общ. пл. 895,2 кв. м, инвен. номер 500/С-2686, по адресу: **г. Минск, ул. Короля, 34)** | **2 442 269,89** бел. руб. |

**В состав лота входит иное имущество, размещенное на сайте организатора торгов www.cpo.by.** Шаг аукциона: 5 % от текущей цены

**Сведения о земельном участке пл. 0,3112***:* предоставлен на праве временного пользования по 30.04.2025 для обслуживания здания административно-хозяйственного

**Задаток 5 % от начальной цены лота** в белорусских рублях перечисляется на р/с BY60BLBB30120191021390001001; в ОАО «Белинвестбанк» (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок подписания договора купли-продажи:** 60 календарных дней после проведения аукциона

**Условия оплаты предмета электронных торгов**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by. **Ответственность** участника аукциона, его **права и обязанности**, **штрафные санкции** прописаны в **соглашении** о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Данное соглашение является договором присоединения и размещается на странице лота во вкладке «Документы» по адресу www.ipmtorgi.by. Страница лота по указанному адресу содержит также информацию о типе торгов и общих правилах их проведения. Победителем аукциона признается участник, предложивший максимальную цену

Победитель аукциона либо единственный участник электронных торгов, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, обязан возместить затраты на их проведение и оплатить вознаграждение организатору аукциона в размере **0,5 %** от цены продажи предмета аукциона в течение **3 (трех) рабочих дней** со дня проведения электронных торгов

Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов без объяснения причин снятия

**Дата и время начала и окончания электронных торгов: с 11.00 до 13.00 18.01.2022**.
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки в случае, если ставка поступила менее, чем за 10 минут до окончания торгов

Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 09.11.2021 г.

**Дата и время окончания приема заявок**

Заявки на участие в электронных торгах принимаются **по 14.01.2022 до 17.00** на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу www.ipmtorgi.by

| | |
|---|---|
| **Контактные данные** | **Тел.: +375 17 280-36-37; 8029-317-95-42. E-mail: auction@cpo.by** |

---

## Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

## ИЗВЕЩАЕТ ОБ АУКЦИОНЕ

**ЛОТ 1: капитальное строение, инв. № 430/С-54581 (назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование – здание склада строительных и расходных материалов), общей площадью 1341,5 кв. м, расположенное по адресу: г. Новогрудок, ул. Советская, 77.**

Лот № 1 расположен на земельном участке, кадастровый № 424350100001005696, площадью 1,4201 га (назначение – земельный участок для обслуживания зданий и сооружений, ведения производственной деятельности), расположенном по адресу: г. Новогрудок, ул. Советская, 77.
Начальная цена продажи лота – 251 760 руб. (двести пятьдесят одна тысяча семьсот шестьдесят рублей) с учетом НДС.
Сумма задатка – 25 176 руб. (двадцать пять тысяч сто семьдесят шесть рублей)

Продавец – открытое акционерное общество «Новогрудский завод газовой аппаратуры», 231400, г. Новогрудок, ул. Мицкевича, 109, тел.: 8-01597-437-71

Организатор торгов – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел. 55-87-70

Условия аукциона – аукцион без условий. Условия оплаты – по договоренности сторон. Срок заключения договора купли-продажи – не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукциона

Номер р/с для перечисления задатка – BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225

**Аукцион состоится 14 января 2022 г. в 11.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3**

Порядок регистрации в качестве участника аукциона и правила проведения аукциона содержатся на сайте организатора аукциона https://grino.by/aukcion

**Заявления на участие принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 208, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30. до 16.30 (пятница). Обед с 12.30 до 13.18**

**Последний день приема заявлений – 12 января 2022 г. до 15.00**

**Телефон для справок: 55-87-71 –**
**Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»**
**https://grino.by/aukcion**

---

**Гродненское областное потребительское общество (Дятловский филиал)**

## ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

**Аукцион № 6522**

## ЛОТ № 36289 – КОМПЛЕКС КАПИТАЛЬНЫХ СТРОЕНИЙ БЫВШЕЙ ОПТОВОЙ БАЗЫ
### г.п. Новоельня, Гродненская обл., Дятловский р-н, г.п. Новоельня, ул. Новогрудская

• капитальное строение с принадлежностями (склады I очереди с рампами), инвентарный номер 451/С-11374, площадью 7576,5 кв. м, целевое назначение – административно-бытовые здания, наименование – административно-бытовые здания, расположенное по адресу: Гродненская обл., Дятловский р-н, г. п. Новоельня, ул. Новогрудская, д. 15;
• капитальное строение, инвентарный номер 451 /С-15228, площадью – 615,0 кв. м, целевое назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование – металлический склад № 5, расположенное по адресу: Гродненская обл., Дятловский р-н, г. п. Новоельня, ул. Новогрудская, д. 15;
• капитальное строение, инвентарный номер 451/С-15201, площадью – 6,0 кв. м, целевое назначение – здание неустановленного назначения, наименование – туалет, расположенное по адресу: Гродненская обл., Дятловский р-н, г. п. Новоельня, ул. Новогрудская, д. 15;
• капитальное строение, инвентарный номер 451 /С-15461, площадью – 0,0 кв. м, целевое назначение – сооружение неустановленного назначения, наименование – ограждение территории, состоящее из ограждения железобетонного 105,59 м, ворот 5,8 м, ворот 6,0 м, расположенное по адресу: Гродненская обл., Дятловский р-н, г. п. Новоельня, ул. Новогрудская, 15/2;
• капитальное строение, инвентарный номер 451/С-15458, площадью – 0,0 кв. м, целевое назначение – сооружение специализированное железнодорожного транспорта, наименование – подъездной железнодорожный путь, протяженность – 451,2 м, расположенное по адресу: Гродненская обл., Дятловский р-н, г. п. Новоельня, ул. Новогрудская, 15/2;
• капитальное строение, инвентарный номер 451/С-15202, площадью – 12,0 кв. м, целевое назначение – здание неустановленного назначения, наименование – контрольно-пропускной пункт, расположенное по адресу: Гродненская обл., Дятловский р-н, г. п. Новоельня, ул. Новогрудская, д. 15.

Лот располагается на следующих земельных участках:
• кадастровый номер 422383190602000812, площадью 0,0036 га, целевое назначение – земельный участок для обслуживания контрольно-пропускного пункта, право постоянного пользования. Адрес: Гродненская обл., Дятловский р-н, г. п. Новоельня, ул. Новогрудская, 15/1. Земельный участок не имеет ограничений (обременений) прав в использовании земель.
• кадастровый номер 422383190602000813, площадью 4,5731 га, целевое назначение – Земельный участок для обслуживания зданий и сооружений, право постоянного пользования. Адрес: Гродненская обл., Дятловский р-н, г. п. Новоельня, ул. Новогрудская, 15/2. Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав в использовании земель. Виды ограничений (обременений): земельные участки, расположенные в охранных зонах электрических сетей, код – 5.2 площадь – 0,0170 га.
• кадастровый номер 422383190602000830, площадью 0,0192 га, целевое назначение – земельный участок для обслуживания подъездного пути со стрелочным переводом №31, право аренды, доля в праве – 1/2. Адрес: Гродненская обл., Дятловский р-н, г. п. Новоельня, в районе ул. Новогрудской. Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав в использовании земель. Виды ограничений (обременений): земельные участки, расположенные на территории, подвергшейся радиоактивному загрязнению (зона проживания с периодическим радиационным контролем), код – 3.5 площадь – 0,0192 га.

Комплекс капитальных строений находится на окраине г. п. Новоельня Дятловского района Гродненской области. Канализационная и водопроводная сети нуждаются в капитальном ремонте. Отопление отсутствует.
Проезд на территорию возможен как железнодорожным, так и автомобильным транспортом

**Начальная цена продажи – 482 359,06 руб.** (четыреста восемьдесят две тысячи триста пятьдесят девять белорусских рублей 06 коп.), в т.ч. НДС

**Начало электронных торгов: 05.01.2022 09.00**

Для участия в электронных торгах на электронной торговой площадке по адресу лота: **https://torgi.gov.by/lot/36289/6522/kompleks-kapital-nyh-stroenij-byvshej-optovoj-bazy** необходимо подать заявку на участие в электронных торгах и пройти регистрацию в качестве участника электронных торгов, а также перечислить задаток

**Продавец** – Гродненское областное потребительское общество (Дятловский филиал), 231471, Гродненская область, г. Дятлово, ул. Ленина, 14, **тел.: 8 (01563) 64581, 68264**

**Организатор аукционов** – Государственное предприятие «Информационный центр Минэкономики», г. Минск, ул. Берсона, д. 1А, оф. 513, **тел.: 8 (017) 200 73 33, 8 (029) 675 98 28**

Задаток – 10 % от стоимости лота перечисляется на счет электронной торговой площадки. Шаг торгов – 5 %.
Срок заключения договора купли-продажи – не позднее 5 календарных дней с момента определения победителя торгов. Условия оплаты – не позднее 30 календарных дней с момента определения победителя торгов.
Расходы по государственной регистрации договора купли-продажи, перехода права собственности возлагаются на Покупателя

Победитель торгов возмещает стоимость затрат на проведение аукциона согласно прейскуранту (**https://torgi.gov.by/assets/docs/priceList/preyskurant.docx**) от фактической цены продажи лота, которая списывается с суммы внесенного Победителем аукциона задатка. Оставшаяся сумма задатка засчитывается в счет оплаты предмета аукциона.
Победитель также возмещает Продавцу расходы по публикации объявлений о проведении аукциона в газете «Звязда» и Дятловской районной газете «Перамога».
Возмещение затрат по организации и проведению аукциона победитель осуществляет не позднее 5 рабочих дней с момента завершения торгов

***Расчетный счет для перечисления задатка: BY88 BELB 3012 0027 8700 2022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ», код банка BELBBY2X, УНП 190318109 ОКПО: 37533622, Государственное предприятие «Информационный центр Минэкономики»***

Для участия в торгах претенденту необходимо зарегистрироваться до начала торгов на торговой площадке согласно инструкции: **https://torgi.gov.by/instruction.**
Порядок регистрации в качестве участника аукциона и правила проведения аукциона содержатся на сайте организатора аукциона: **https://torgi.gov.by/info/auction-rule**

Весткі з месцаў

# НЯХАЙ УСЁ АТРЫМАЕЦЦА!




**Не так даўно ў нашай цэнтральнай бібліятэцы імя Пушкіна адбылася прэзентацыя другой кнігі Даніїла Мазаля «Я ёсць». Што цікава, аўтару яе — усяго васямнаццаць, ён вучыцца ў школе. Любіць чытаць, вандраваць па Беларусі, катацца на ровары, слухаць птушак. Яму падабаюцца фільмы пра выратаванне людзей, і сам ён хацеў бы стаць ратавальнікам. Нават, калі атрымаецца, — чалавечых душ.**

Маці юнага пісьменніка адзначае, што ў жыццё іх сям'і разам з Даніїлам, нягледзячы на яго цяжкае захворванне, прыйшло вельмі шмат радасці. Ён з'явіўся нібыта спецыяльна для таго, каб вучыць мужнасці і духоўнасці, каб надаваць людзям веры і сілы.

Трэба сказаць, што хлопцу гэта ўдаецца, хоць яго літаратурныя здольнасці былі заўважаны далёка не адразу. Ды і праявіліся яны, можна сказаць, выпадкова. Маці хлопчыка Ірына Іванаўна расказала, што раней, у час канікул, кожны летні дзень Даніілу трэба было рашыць пяць матэматычных прыкладаў і напісаць мінімум пяць радкоў тэксту для таго, каб распрацоўваць руку. Якраз гэтыя руцінныя практыкаванні хлопцу і надакучылі, у 16 гадоў ён стаў займацца літаратурнай творчасцю — пісаць кароткія апавяданні пра сваіх любімых жывёлін (дома жыве сабака), пра бібліятэку, пра дзяцей.

...У час прэзентацыі ўжо другой сваёй кнігі Даніїл расказаў, што першую пісаў тры месяцы, у асноўным у час летніх канікулаў, бо ў іншы — робіць дамашнія заданні. І, дарэчы, вучыцца ён амаль на «выдатна»: не мае ніводнай «сямёркі».

Не дзіва, што ў адрас маладога пісьменніка прагучала вельмі шмат цёплых слоў, што падчас прэзентацыі ён атрымаў нямала каштоўных падарункаў. У прыватнасці, кіраўнік студыі рукадзелля Галіна Юр'еўна Мельнічук уручыла Даніілу самаробнага анёла, каб ён дапамагаў юнаку ва ўсіх яго творчых пачыннаннях; дырэктар фонду «Новае пакаленне» Алена Уладзіміраўна Францэвіч перадала хлопцу 50 экзэмпляраў яго кнігі і паведаміла, што па адным яе асобніку будзе накіравана ў самыя аўтарытэтныя бібліятэкі краіны.

У нашай жа, брэсцкай, у час прэзентацыі другой кнігі «Я ёсць» з'явіліся героі першай — дзяўчынка Варвара і настаўніца беларускай мовы і літаратуры Алена Яўгенаўна Пракапюк. Шчыра павіншаваўшы вучня з новай творчай удачай, педагог пажадала, каб яго кнігі ўвайшлі ў школьную праграму, каб яна калі-небудзь змагла зайсці ў клас і сказаць сваім вучням, што зараз мы будзем чытаць кнігу маладога пісьменніка Даніїла Мазаля.


Даніїл з сям'ёй і з высокімі гасцямі.

...А пакуль, як і пісьменнікі больш сталага веку, малады адказваў на пытанні чытачоў, прымаў кампліменты і пажаданні. Завяршылася сустрэча цёплым выступленнем намесніка дырэктара бібліятэкі Святланы Іванаўны Івашковай, якая падарыла Даніілу афішу з прэзентацыі, а таксама камплект візітовак «Даніїл Мазоль, аўтар серыі кніг «Я ёсць».

Сімвалічна, што юны пісьменнік, нягледзячы на сваю хваробу, змог захаваць аптымізм і любоў да жыцця, дасягнуць істотных творчых поспехаў, стаць прыкладам для іншых —- часта здаровых целам, але слабых духам, а магчыма, і падштурхнуць да таго, каб чытаць, каб ствараць, каб далучацца да нечага чыстага і ўзнёслага.

...Даніїл марыць стаць ратавальнікам, прычым — ратавальнікам душ. Няхай гэтая мара спраўдзіцца!

**Святлана Сёміна, настаўніца.**

*г. Брэст.*

**Фота аўтара.**

Людзі і лёсы

# ДОБРА ЎСЮДЫ... А ДОМА — НАЙЛЕПШ

**Кажуць, жыццё пражыць — не песеньку спець, не люльку выкурыць, што ў ім, як у рошчыне хлеба, павінны быць і добрая мука, і вада горкіх слёз, і цукар, і соль... Вось бы толькі ўсяго ў меру.**

**Вытрымаць яе стараецца кожны кухар, аднак не кожнаму тое ўдаецца. Хрысціне Лявонаўне Дамашэвіч як быццам пашчасціла.**

Яшчэ змалку ў школе і потым у мединстытуце яна вылучалася не толькі вонкавай прыгажосцю, але і старраннай вучобай. Лічыла, што сярод іх, будучых медыкаў, не можа быць троечнікаў, што найперш трэба атрымаць прафесію.

Не ўсе студэнты ды іншыя маладыя людзі згаджаліся з такім меркаваннем, многія спрабавалі пераканаць яе ў іншым: маўляў, пралятаюць найлепшыя гады, а таму не вучобай адной: трэба заводзіць раманы, бегаць на спатканні, нават выходзіць замуж... Яе клікалі.

Прыгажуня была непрыступнай. Толькі праз гады, ужо загадчыцай кардыялагічнага аддзялення ў Свіслачы, яна закахалася ў дырэктара мясцовай гаспадаркі — яе пераканалася потым, чалавека вельмі ўладарнага і настолькі ж... раўнівага, прычым — без падстаў.

З часам у іх сям'і з'явіўся сынок, а вось згоды і душэўнай гармоніі так і не было: яны абодва ўсё больш падумвалі пра тое, каб разысціся, раз'ехацца па розных кватэрах.

Абставіны ім паспрыялі: Хрысціну Лявонаўну запрасілі працаваць у Мінскую абласную бальніцу, і яны з сынам пераехалі ў пасёлак Лясны.

...У калектыве кардыялагічнага аддзялення новую доктарку — заўсёды элегантную і далікатную ў чалавечых зносінах — прынялі як сваю, як роўную, хоць яна такой сябе не адчувала. Асабліва спачатку, бо побач працавалі кандыдат медыцынскіх навук Уладзімір Купрыянавіч Крывіцкі, спецыялісты найвышэйшага класа Лідзія Паўлаўна Чуткіна, Клаўдзія Сяргееўна Быстрова... Сюды ж, пасля заканчэння мединстытута і службы ў войску, прыйшоў працаваць яе сын.

І ўсё б, відаць, было, як ва ўсіх, калі б не пачался перабудова з уласцівымі ёй затрымкамі зарплаты, калі б маме не захацелася ўвязацца ў дачны бум. Недахоп грошай падштурхнуў сына да паездкі за так званы кардон — на заробкі.

Пачынаў ён там, у Злучаных Штатах, з «пасады», можна сказаць, сядзелкі — з догляду за цяжкахворым багацеем. А паралельна пацвярджаў сваё веданне мовы і медыцынскіх дысцыплін, набіраўся вопыту, пасля чаго ўжо не было складанасцяў ні з работай, ні з грашыма, ні са стварэннем сям'і.

...Усё больш настойліва сын запрашаў маму прыехаць, а то і пераехаць — жыць разам. Яна доўга вагалася, не спала па начах у пакутлівым роздуме, хоць, здавалася б, над чым: тут яна адна, там — самыя блізкія людзі, яе сынок (як прывыкла казаць — адзіны падарунак ад Бога), яе нявестка, родныя ўнукі...

І вось яна ў сталіцы штата Каларада. Найлепшыя ўмовы, клопат, увага, трое пацешных нашчадкаў, а душу, як начны туман, ахінае самота...

Праз тры месяцы яна вярнулася ў свой, можна сказаць, родны пасёлак, на сваё лецішча, у свой касцёл, да сваіх людзей — зажыла па-ранейшаму.

І сын яе таксама па-ранейшаму клікаў да сябе, настойваў на пераездзе: па «Вайберы» паказваў купленую для яе шыкоўную «фазэнду» з усімі магчымымі «наваротамі», абяцаў рускамоўную памочніцу па гаспадарцы, істотную грашовую дапамогу... Не дзіва, што маці паддалася на гэтыя ўгаворы: яшчэ раз адправілася ў далёкае падарожжа.

Казала потым, што ўмовы там і сапраўды былі найлепшыя — райскія, але нават у іх яна адчувала сябе ў клетцы, хоць і залатой: чужыя вуліцы, людзі, мова... Ды што там — нават сонца ёй здавалася нейкім не тым — халодным і бляклым. А вось дома, на Радзіме...

Усё часцей яна клікала да сябе, ад чаго даймала бяссонніца, абвастраліся прытухлыя хваробы, прападаў апетыт.

Сын і яго сям'я, вядома ж, бачылі гэта і нічога зрабіць не маглі: з жалем праводзілі маму ў аэрапорт.

...А ў Мінску яе ўжо чакалі і сустракалі, пыталі: «Ну як там у Каларада?» — «Добра, — адказвала ўсім, — але дома ўсё ж такі лепш».

**Ніна Бурко,**

*Бярэзінскі раён.*

Напярэдадні

# «ПАСЯРЭДЗІНЕ ЗІМЫ КАЛЯДУ СВЯТКУЕМ МЫ...»

**Як ёсць, так ёсць: чытачы па-ранейшаму пішуць у рэдакцыю, мы — пішам ім. Як правіла, асабіста і па сутнасці.**

**Аднак бываюць пытанні, якія хвалююць не толькі таго, хто піша. Таму адказы на іх — праз газету і ў звыклым парадку:**

### ліст у рэдакцыю

*«У эпіграфе «Звязды» значыцца, што яна родная на роднай мове. Але ж у нашых слоўніках няма такога беларускага слова, — піша ў рэдакцыю **спадар Васіль Тарасенка з Віцебска**. — Ёсць зоры, зорачкі, заранкі... Тады адкуль узялася «Звязда»?*

### Ліст з рэдакцыі

На гэтае пытанне мы, вядома ж, не раз адказвалі, аднак калі ёсць патрэба, то разам з новымі падпісчыкамі разгорнем «Беларускую энцыклапедыю» (Мінск, 1998 г., т. 7). Паводле яе «Звязда» — гэта, па-першае, штодзённая грамадска-палітычная газета, якая выходзіць з 1917 года... Падругое — ***рухомая шматпрамянёвая асветленая знутры зорка на кіі, з якой хадзілі так званыя звездары, атрыбут калядная абраднасці...***

Далей у энцыклапедыі ідзе досыць падрабязны расказ пра тое, з чаго і як ён, гэты атрыбут, рабіўся, чым упрыгожваўся, а таксама фатаграфія хлопчыка (здымак зроблены ў 1940-я гады) з вёскі Капылы Камянецкага раёна з гатовым вырабам.

Звычай жа нашэння звязды, як паведамляецца ў артыкуле, быў пашыраны да 1920—30-х гадоў.

Але ж і ў гэтым, 21-м, стагоддзі звёзды — як сімвал сонца — падчас Каляд паранейшаму «запальваюцца»! Ахвотныя пераапранаюцца ў «мядзведзя», «казу» і «жорава», ходзяць па хатах, кватэрах і офісах — віншуюць гаспадароў і сваіх дзелавых партнёраў, частуюцца, спяваюць калядныя песні, прыпеўкі...

Дарэчы, сапраўдных мастакоў і спеваць, і складаць іх сярод падпісчыкаў «Звязды» многа: ім, як сведчыць пошта, толькі слова дай...

Якраз гэта напярэдадні свят мы і робім: друкуем два першыя радкі з некалькіх прыпевак **спадара Івана Астроўскага з Мінска.** Дамашняе заданне — прыдумаць працяг, а калі з'явіцца натхненне, то і свае ўласныя творыкі ў гэтым жанры. Стартуем?

*Як у дзень на Каляду*
*Зноў дастанем мы звязду...*
*ххх*
*Наступае Каляда —*
*Цякуць грошы, як вада...*
*ххх*
*На Каляды кожны ласы*
*На гарэлку і каўбасы...*
*Ххх*
*На Каляды і дзівак*
*З'есці, выпіць не лайдак...*

Найлепшыя прыпеўкі «Звязда» абяцае надрукаваць — у дапамогу звездарам, калядоўшчыкам, усім прыхільнікам свайго, роднага... Удачы!


Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Межы даўгалецця

# АДЗНАЧЫЦЬ 150 ГАДОЎ

## Такая максімальна магчымая працягласць жыцця чалавека

**Біёлагі з Расіі, ЗША і Сінгапура стварылі тэст, які па аналізе крыві можа вызначыць агульны стан арганізма і фізіялагічную ўстойлівасць. Пра гэта паведаміў навуковы часопіс Nature Communications.**



Група даследчыкаў пад кіраўніцтвам Пятра Федзічава з Маскоўскага фізіка-тэхнічнага інстытута прапанавала выкарыстоўваць для ацэнкі біялагічнага старэння універсальны комплексны паказчык DOSI (dynamic organism state indicator — індыкатар дынамічнага стану арганізма). Па іх даных, гэты індыкатар залежыць ад наяўнасці хвароб, узросту і спосабу жыцця. Узровень устойлівасці навукоўцы разлічвалі пры дапамозе даных аб фізічнай актыўнасці, якія яны атрымлівалі з датчыкаў, прымацаваных да ўдзельнікаў даследавання.

Па словах біёлагаў, найменш устойлівы арганізм становіцца да 120—150 гадоў. Такім чынам, у артыкуле робіцца выснова, што 150 гадоў — максімальная тэарэтычна магчымая працягласць жыцця чалавека.

Як заявіў Федзічаў, навукоўцы падсумавалі: узроставая мяжа, якая прыводзіць да смерці, «з'яўляецца неад'емнай біялагічнай уласцівасцю арганізма, што не залежыць ад фактараў стрэсу і азначае фундаментальную або абсалютную мяжу працягласці жыцця чалавека».

Ад пачатку свету

# ЗАМЕНА ТЫРАНАЗАЎРУ

## Навукоўцы адкапалі астанкі новага дыназаўра



**Гэта адбылося ва Узбекістане, ён мог быць галоўным драпежнікам экасістэмы ў Азіі і пераўзыходзіў нават тыраназаўра. Аб неверагодным адкрыцці піша Royal Society Open Science.**

Знойдзенымі акамянеласцямі зацікавіліся навукоўцы з Канады і Японіі. Вывучыўшы іх, яны, можна сказаць, даведаліся пра колішняе існаванне новага дыназаўра. Аказалася, што рэптылія жыла на Зямлі 90 мільёнаў гадоў таму і пры гэтым была галоўным драпежнікам у харчовым ланцугу Сярэдняй Азіі. Да адкрыцця вяршыняй харчовага ланцуга свайго часу лічылі тыраназаўра.

Даследчыкі назвалі рэптылію Улугбегзаўрам (Ulughbegsaurus uzbekistanensis) у гонар выдатнага сярэднеазіяцкага вучонага і дзяржаўнага дзеяча па імені Улугбек.

На думку навукоўцаў, жывёліна адносілася да роду кархарадантазаўраў. У дыназаўра былі «акулавыя» зубы, якія выраслі да 15 сантыметраў у даўжыню. Вышыня драпежніка дасягала васьмі метраў, вага вар'іравалася ад адной да сямі тон.

Здароўе на талерцы

# ЦАНА ФАСТ-ФУДУ

## Ацэнены ўплыў ужывання хот-догаў на працягласць жыцця



**Даследчыкі з Мічыганскага ўніверсітэта ЗША разлічылі, колькі часу жыцця адымае або дадае спажыванне таго ці іншага прадукту. Пра гэта паведаміла газета The Telegraph.**

Спецыялісты распрацавалі стандартызаваную сістэму разліку, пры дапамозе якой змаглі ацаніць больш за шэсць тысяч тыпаў страў і прадуктаў. У выніку навукоўцы высветлілі, што ў сярэднім кожны грам каўбасных вырабаў, з'едзеных чалавекам, пазбаўляе яго 27 секундаў жыцця.

Даследчыкі дадалі, што з улікам іншых фактараў адзін хот-дог «абыдзецца» чалавеку ў 36 хвілін працягласці жыцця, порцыя колы — 12,5 хвіліны. Акрамя таго, негатыўна адбіваецца і спажыванне чырвонага мяса.

Між тым, падкрэслілі навукоўцы, існуе мноства карысных у плане доўгажыхарства прадуктаў. Напрыклад, порцыя арэхаў дадае 26 хвілін, а ласось — 16 хвілін, адзначае Pravda.Ru. Таксама да карысных прадуктаў спецыялісты аднеслі садавіну, агародніну і бабовыя.

На аснове разлікаў, якія таксама бралі пад увагу ўплыў прадуктаў на навакольнае асяроддзе праз спосабы вытворчасці і захоўвання, эксперты рэкамендавалі паялічваць спажыванне рыбы і расліннай ежы.

Пласты гісторыі

# ПРЫНЯЎШЫЯ ХРЫСЦІЯНСТВА

## Тысячагадовыя могілкі вікінгаў знайшлі ў Швецыі

**Вучоныя выявілі старажытнае пахаванне гэтых вараў, датаванае як мяркуецца, X стагоддзем нашай эры. Пра гэта паведаміла брытанскае выданне The Daily Mail.**



Археолагі знайшлі могілкі падчас абследавання тэрыторыі горада Сігтуна. Спецыялісты мяркуюць, што вікінгі, астанкі якіх былі знойдзеныя ў сямі магільніках, прынялі хрысціянства перад смерцю. Усяго былі знойдзеныя астанкі чатырох дарослых людзей і чатырох дзяцей. Шэсць магіл былі адзінкавыя, а ў сёмай — пахаваныя двое немаўлят, якія, відаць па ўсім, былі заўчасна народжанымі блізнятамі.

Астанкі размяшчаліся на спіне ў становішчы ўсход-захад, што супярэчыць традыцыйным спосабам пахавання ў вікінгаў, якія крэміравалі нябожчыкаў. Па словах спецыялістаў, арыентацыя целаў памерлых з усходу на захад паказвае на тое, што людзі перад смерцю прынялі хрысціянства.

Нябачная пагроза

# УСЯ СПРАВА Ў СТРЭСЕ

## У ЗША прапанавалі спосаб вярнуць колер сівым валасам

**Амерыканскія спецыялісты з Медыцынскага цэнтра Ірвінга пры Калумбійскім універсітэце распавялі, як можна тое зрабіць. Пра гэта гаворыцца ў часопісе eLife.**



У ходзе даследавання навукоўцы вывучылі стан валасоў 14 чалавек. Удзельнікі эксперыменту павінны былі апісваць у дзённіку стрэсавыя сітуацыі, якія кожны дзень адбываліся з імі.

Сярод узораў даследчыкі вылучылі адзін, у якім раней была заўважана сівізна, але бліжэй да каранёў колер пачаў вяртацца. Спецыялісты супаставілі даты і час з пігментамі, якія аднавіліся, і ўстанавілі, што пазбавіцца ад сівізны дапамог паніжаны ўзровень стрэсу падчас знаходжання ў адпачынку. Навукоўцы заключылі, што для таго каб пазбавіцца ад сівізны, варта знізіць узровень стрэсу ў жыцці.

Раней урач-псіхіятр Ігар Лазараў растлумачыў, чаму пры высокім узроўні стрэсу пачынаюць сівець валасы. Ён пяснiў, што гэта адбываецца з-за вялікай колькасці гармону норадрэналіну, які выпрацоўваецца падчас стрэсавых сітуацый.

Біялогія з анатоміяй

# НЕ БРАШЫЦЕ НАМ!

## Устаноўлена здольнасць сабак распазнаваць хлусню



**Супрацоўнікі з Венскага ўніверсітэта выявілі, што сабакі ў залежнасці ад абставін здольныя вызначаць хлусню чалавека. Вынікі даследавання былі апублікаваныя ў адным з асноўных друкаваных выданняў Лонданскага каралеўскага таварыства — Proceedings of the Royal Society B.**

У ходзе даследавання спецыялісты правялі тры эксперыменты, удзел у якіх узялі 260 сабак розных парод. Перад імі ставілі па дзве непразрыстыя міскі, у адной з якіх быў ласунак, а другая заставалася пустой. Пасля падыходзіў адзін з добраахвотнікаў, якога сабакі раней ніколі не бачылі, і пачынаў падказваць ім, у якой місцы знаходзіцца ежа. Жывёліны выбіралі паказаную ёмістасць, атрымлівалі ўзнагароду і пачыналі яму даваць.

Затым у прысутнасці паддоследных незнаёмы чалавек пераносіў ежу з адной міскі ў іншую, а чалавек з першай часткі эксперыменту назіраў за тым, што адбываецца. Потым працэдура паўтаралася без яго прысутнасці.

Пасля таго навукоўцы паўтарылі першую частку эксперыменту і высветлілі, што жывёлы ігнаруюць параду чалавека, калі яго не было побач падчас перакладання ежы.

Даследчыкі таксама адзначылі, што каля паловы сабак не паслухаліся парады чалавека, калі той бачыў, як перамяшчаюць ласунак, але спрабаваў пераканаць іх, што ён ляжыць у іншай місцы. На думку навукоўцаў, гэта сведчыць аб тым, што сабакі здольныя адрозніваць чалавечую хлусню.

**Сяргей СТАРЫНАЎ.**
**Фота з адкрытых крыніц.**

На слыху

Дзмітрый ПІНЕВІЧ:

# «АМІКРОН-ШТАМ КАРАНАВІРУСА Ў БЕЛАРУСІ ПАКУЛЬ НЕ ВЫЯЎЛЕНЫ»

**Шпіталізацыя з ковід-пнеўманіямі ў Беларусі сёння складае 30 % ад піка хвалі, да канца гэтага года плануецца вакцынаваць палову насельніцтва, а штам «Амікрон» у краіне пакуль не выяўлены. Пра гэта расказаў міністр аховы здароўя Дзмітрый Піневіч, які ўзяў удзел у пасяджэнні сумеснай калегіі міністэрстваў аховы здароўя Расіі і Беларусі ў Маскве.**



Дзмітрый Піневіч таксама расказаў, што ў рамках Саюзнай дзяржавы абмяркоўваецца пытанне стварэння агульнай базы вакцынаваных грамадзян Беларусі і Расіі, паведамляе прэс-служба Міністэрства аховы здароўя Беларусі.

Пытанне абмяркоўваецца на базе Саюзнай дзяржавы і на базе ЕАЭС. Гаворачы аб магчымасці стварэння агульнай базы вакцынаваных беларусаў і расіян, міністр адзначыў, што першы крок у такім напрамку ўжо зроблены — гэта ўкараненне ўзаемнага прызнання тэсціравання ў дадатку «Падарожнічаю без COVID-19». Другі этап — прызнанне сертыфікатаў — і трэці — агульная база абмену даных.

Вытворчасць вакцыны «Спадарожнік V» плануецца цалкам лакалізаваць у Беларусі ў наступным годзе. Цяпер ідуць перагаворы з вытворцамі іншых расійскіх вакцын аб арганізацыі іх вытворчасці на беларускіх прадпрыемствах.

Што датычыцца выяўлення новых штамаў, то сістэма аховы здароўя павінна быць гатовая да любога развіцця падзей, падкрэсліў Дзмітрый Піневіч.

— Так, мы рыхтуемся, безумоўна, але мы не чакаем якіх-небудзь значных зменненяў у эпідэмічнай абстаноўцы, — дадаў ён. — На сёння амікрон-штам каранавіруса ў Беларусі пакуль не выяўлены. Мы яго шукаем усімі ўзмоцненымі спосабамі. Мы бачым з адкрытых крыніц, што гэты штам выклікае захворванне не цяжэйшае, чым штам «Дэльта». Ён распаўсюджваецца хутчэй, кажучы простай мовай, але пры гэтым цяжар захворвання не вышэйшы, чым ад дэльта-віруса. Пра гэта кажуць даследаванні.

Міністр адзначыў, што агульны імунітэт дасягаецца як за кошт вакцынацыі, так і за кошт імунітэту тых, хто перахварэў:

— Тое, што хваля пайшла ўніз, сведчыць, што агульны імунітэт на дадзены момант спрацаваў. Ахоп вакцынацыі першым кампанентам ужо перавышае 40 працэнтаў. Я думаю, што да канца гэтага года будзе 50 %. Узровень захваральнасці, шпіталізацыі з пнеўманіямі ў нас цяпер складае менш за 30 % ад хвалі, якая была. Таму масава ўстановы перапрафілююцца назад — на аказанне той медыцынскай дапамогі, для якой гэтыя ўстановы былі прызначаны.

Пры гэтым Дзмітрый Піневіч асабліва падкрэсліў той факт, што ў Беларусі падчас пандэміі аказанне планавай медыцынскай дапамогі не спынялася. І распавёў, што нароўні з імунізацыяй супраць COVID-19 сістэму аховы здароўя хвалюе кампанія па вакцынацыі супраць грыпу. Паводле яго слоў, бягучы ўзровень ахопу прышчэпкамі супраць грыпу набліжаецца да 30 %. Ён дадаў, што цяпер у Беларусі фіксуюцца выпадкі захворвання на грып тыпу А.

Скажыце, доктар...

# АДНАЎЛЕННЕ ПАСЛЯ COVID-19

## Што мусіць рабіць кожны, хто перахварэў

**Перанесеная нават у лёгкай форме COVID-інфекцыя не праходзіць бясследна. Людзі скардзяцца на задышку, асабліва пасля фізічнай нагрузкі, зніжэнне працаздольнасці, прыступы галавакружэння, сухі кашаль і боль у грудзях. Каб мінімізаваць такія наступствы, неабходны перыяд аднаўлення. Ганна РОДЗІЧ, урач па медыцынскай прафілактыцы Мінскага абласнога цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя, расказала, як дапамагчы сабе пасля выпіскі з бальніцы ці перахварэўшы дома, каб рэабілітацыя прайшла найхутчэй і з максімальнай карысцю для арганізма.**



— Сёння няма спецыяльных медыкаментаў і тэхналогій, здольных хутка аднавіць здароўе, аднак ёсць комплекс мерапрыемстваў, які можа падтрымаць аслаблены арганізм у гэтай сітуацыі, — кажа ўрач. — Ён уключае дыхальную гімнастыку, фізічную актыўнасць і псіхаэмацыянальнае здароўе.

Акрамя таго, чалавеку, які перанёс пнеўманію ці нават проста перахварэў на каранавірусную інфекцыю, неабходныя спакой і правільны пітны рэжым з ужываннем не менш за два літры вады ў суткі, не лічачы іншых напояў. У перыяд захворвання і пасля дыетолагі раяць, па-першае, беражлівае харчаванне, якое складаецца з супаў-пюрэ і страў на пары, па-другое, выключыць смажанае, тлустае, салодкае, кансервы, фастфуд. І, натуральна, звесці да мінімуму паступленне ў арганізм нікаціну, кафеіну і алкаголю.

### Пачынаем з дыхальнай гімнастыкі

Існуе мноства практык, якія не патрабуюць спецыяльнай падрыхтоўкі, іх можна выконваць самастойна і ў хатніх умовах у прахалодным, добра праветраным памяшканні. Сядзьце ў зручнае становішча так, каб спіна мела добрую апору, пакладзіце адну руку на грудзі, а другую на жывот і сканцэнтруйцеся на дыханні. Рабіце павольныя ўдыхі праз нос (ці рот, калі не можаце інакш) і павольныя выдыхі праз рот. Старайцеся дыхаць павольна, расслаблена, роўна і спакойна, прыкладаючы як мага менш намаганняў.

Спачатку дыхайце так, каб паднімалася толькі рука, якая ляжыць на грудзях. Затрымайце паветра і затым выдыхніце яго праз рот. Паўтарыце некалькі разоў. Цяпер, наадварот, дыхайце так, каб паднімалася толькі рука, якая ляжыць на жываце. Грудзі не павінны рухацца. Паўтарыце некалькі разоў. Цяпер паспрабуйце па чарзе дыхаць так, каб спачатку паднімалася рука, якая ляжыць на жываце, а затым — рука, якая ляжыць на грудзях. Пасля гэтага дыхайце глыбока, выкарыстоўваючы адначасова абодва віды дыхання, і рабіце невялікія паўзы паміж удыхам і выдыхам.

Можна выкарыстоўваць метранамізаванае дыханне — павольнае глыбокае дыханне жыватом. Ім карысна карыстацца, напрыклад, пры ўздыме па лесвіцах або па дарозе, якая ідзе ўгару. Павольнае дыханне таксама дапамагае зменшыць стрэс і з'яўляецца яшчэ адной разнавіднасцю стратэгіі рэлаксацыі.

### Дадаём фізічную актыўнасць

Памяншэнню стрэсу і зніжэнню імавернасці развіцця дэпрэсіі ў большай меры садзейнічае фізічная актыўнасць. Пасля хваробы яе інтэнсіўнасць трэба павялічваць паступова. Пачынаць працэс аднаўлення можна з пешых прагулак на свежым паветры. З кожным разам ускладняйце іх: павялічвайце адлегласць ці хадзіце ўгару. Калі сілы адновяцца, можна вярнуцца да заняткаў у басейне і прагулак на лыжах, на веласіпедзе.

Ганна Родзіч прыводзіць прыклады нескладаных практыкаванняў, якія можна выконваць дома.

✓ Седзячы на крэсле, павольна паднімайце плечы як мага вышэй і апускайце іх.

✓ Зрабіце павольныя кругавыя рухі плячыма наперад, затым назад.

✓ Устаньце, пастаўце ногі на шырыню плячэй і апусціце рукі ўздоўж цела. Зрабіце невялікія нахілы ў бок — спачатку ў адзін, затым — у іншы. Рукі спакойна слізгаюць уніз уздоўж цела.

✓ Прысядзьце на крэсла. Па чарзе павольна паднімайце і апускайце калені.

✓ Пастуквайце па чарзе па паверхні падлогі пальцамі і пяткай адной нагі, потым пальцамі і пяткай другой.

✓ Седзячы на крэсле, выконвайце кругавыя рухі ступнёй спачатку левай, а затым правай нагі.

✓ Выконвайце хаду на месцы. Можна трымацца за спінку крэсла. Паступова павялічвайце вышыню падымання ног (пажадана, каб калені паднімаліся да ўзроўню таза).

Практыкаванні рэкамендуецца рабіць у тры падыходы па 10 паўтораў кожнае, з кароткім перапынкам для адпачынку паміж падыходамі. Можна пачынаць з меншай колькасці паўтораў, паступова даводзячы іх лік да 10. Калі практыкаванні даюцца без цяжкасцяў і ў поўным аб'ёме, выкарыстоўвайце абцяжарванне, каб прымусіць вашы мышцы працаваць мацней. Гэта могуць быць невялікія гантэлі ці бутэлькі з вадой.

Не забывайце трымаць постаць і ўцягваць жывот, выконваючы практыкаванні ў павольным тэмпе. Рабіце ўдых, калі рыхтуецеся выканаць самую цяжкую частку практыкавання, і выдых — калі прыкладаеце намаганне.

### Ускладняем заняткі

✓ Згінаючы рукі ў локцевых суставах, павольна падніміце іх да плячэй, затым павольна апусціце ўніз.

✓ Устаньце на адлегласці каля 30 сантыметраў ад сцяны. Пакладзіце выцягнутыя рукі на сцяну пальцамі ўверх на ўзроўні плячэй, захоўваючы прамое становішча тулава, сагніце локці і апусціцеся да сцяны, затым павольна адштурхніцеся ад яе, вяртаючыся ў зыходнае становішча. Каб павялічыць інтэнсіўнасць, адыдзіце далей ад сцяны.

✓ Рукі апушчаны ўздоўж цела, далоні звернуты ўнутр. Падніміце абедзве рукі ў бакі (максімальна да ўзроўню плячэй), затым павольна апусціце іх уніз. Каб павялічыць інтэнсіўнасць практыкаванняў, павялічце вышыню, на якую паднімаеце рукі, або вагу, якую выкарыстоўваеце пры выкананні.

✓ Сядзьце ў крэсла, расставіўшы ногі на шырыню сцёгнаў. Выцягнуўшы рукі ўздоўж цела або скрыжаваўшы на грудзях, павольна ўстаньце, утрымліваючы становішча на лік 3, затым павольна сядзьце назад на крэсла. Увесь час трымайце ногі на падлозе. Калі выкананне гэтага практыкавання даецца цяжка, скарыстайцеся дапамогай рук.

Каб павялічыць інтэнсіўнасць, зрабіце працэс уставання як мага павольней ці выконвайце практыкаванне з дапамогай ніжэйшага крэсла, з абцяжарваннямі, прыціснутымі да грудзей.

✓ Сядзьце ў крэсла, паставіўшы ногі разам. Выпрастайце адну нагу ў каленным суставе, утрымліваючы яе, затым павольна апусціце. Паўтарыце практыкаванне з другой. Каб павялічыць інтэнсіўнасць практыкавання, павялічце час утрымання выцягнутай нагі ці запавольце тэмп выканання.

✓ Устаньце спінай да сцяны ці іншай устойлівай паверхні, злёгку расставіўшы ногі. Пастаўце ступні ног на адлегласці прыкладна 30 см ад сцяны і злёгку развядзіце іх у бакі. Упіраючыся спінай у сцяну або трымаючыся за крэсла, павольна сагніце калені, спіна будзе слізгаць уніз па сцяне. Вашы сцёгны павінны заставацца вышэй каленяў. Пасля невялікай паўзы выпрастайце калені.

✓ У становішчы стоячы пакладзіце рукі на ўстойлівую паверхню для падтрымання раўнавагі, павольна падніміцеся на дыбачкі і вярніцеся ў зыходнае становішча. Каб павялічыць інтэнсіўнасць практыкавання, утрымлівайце стойку на дыбачках, лічачы да трох, папераменна ўставайце на кончыкі пальцаў адной нагі.

Такія практыкаванні рэкамендуецца рабіць на працягу 20—30 хвілін пяць дзён у тыдзень. Дарэчы, да ліку практыкаванняў можа быць аднесена любая фізічная актыўнасць, у выніку якой глыбіня і частата дыхання ўмерана павялічваюцца. Каб не падвяргаць арганізм перагрузкам, працягласць і інтэнсіўнасць практыкаванняў варта павялічваць паступова.

### Кнігі, музыка і хобі

Для псіхаэмацыянальнага дабрабыту і папраўкі немалаважнае значэнне мае падтрыманне сацыяльных сувязяў. Гутаркі з блізкімі не толькі памяншаюць стрэс, але і дапамагаюць знайсці спосабы пераадолення цяжкасцяў і праблем, звязаных з аднаўленнем здароўя. Таму паведамце сваім сваякам, сябрам і знаёмым, што ў перыяд аднаўлення вам будзе прыемна і карысна пагутарыць з імі.

Займайцеся тым, што не надта стамляе: чытайце, слухайце прыемную музыку. Паступова павялічвайце сваю бытавую і працоўную дзейнасць, не забывайце пра хобі — занятки любімай справай спрыяюць паляпшэнню настрою.

Практыкаванні могуць дапамагчы і аднаўленню функцый галаўнога мозгу, хоць пры наяўнасці такіх сімптомаў, як слабасць, задышка ці стомленасць, гэта будзе няпроста, памятайце: фізкультура з'яўляецца добрым пачатковым спосабам узнаўлення здароўя. Галаваломкі, гульні са словамі і лічбамі, практыкаванні для развіцця памяці дапамогуць вярнуць страчаныя навыкі і хуткасць рэакцыі. Пачніце з простых заняткаў, паступова ўскладняючы іх.

— Вяртанне да ранейшай паўсядзённай актыўнасці павінна быць паступовым. Не спрабуйце прыступіць да выканання ўсіх сваіх ранейшых функцый, пакуль не адчуеце, што гатовы да гэтага. Аднаўленне пасля каранавіруса можа заняць не адзін месяц, таму набярыцеся цярпення і планамерна выконвайце рэкамендацыі, — нагадвае ўрач.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

## Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению антикризисного управляющего ООО «Юрстайл групп» (220035, г. Минск, ул. Тимирязева, 67, офис 1404) проводит в процедуре экономической несостоятельности (банкротстве)

***на основании Решения Экономического суда Минской области от 16.04.2020 по делу № 290-17Б/2019***

## повторный открытый аукцион по продаже имущества ДУП «Передвижная механизированная колонна № 185» УП «Минскоблсельстрой» (222410, Минская область, г. Вилейка, пос. Чапаева, 50, УНП 690018995) в составе:

| № лота | Наименование | Начальная цена, без учета НДС, бел. руб. | Задаток, бел. руб. |
|---|---|---|---|
| 1 | Станок фуговальный СФ4-1Б, 1998 г. в., заводской № 153564, инвентарный номер 04214211 | 2 700,00 | 270,00 |
| 2 | Станок фрезерный деревообрабатывающий ФСШ-1А, инвентарный номер 04214206 | 4 050,00 | 405,00 |
| 3 | Станок сверлильно-пазовальный СВПГ-2А, 1991 г. в., заводской № 1164 | 3 330,00 | 333,00 |
| 4 | Станок прирезной многопильный ЦМР-4, инвентарный номер 04214224 | 4 140,00 | 414,00 |
| 5 | Станок строгальный четырёхсторонний С25-4А, заводской № 96-1991, инвентарный номер 04214219 | 7 290,00 | 729,00 |
| 6 | Рама лесопильная Р63-4Б, 1978 г. в.; в комплекте тележка подающая 1 шт., тележка принимающая 1 шт., тележки малые 2 шт., инвентарный номер 04214222 | 9 270,00 | 927,00 |
| 7 | Рама лесопильная Р63-4Б, 1984 г. в.; в комплекте тележка подающая 1 шт., тележка принимающая 1 шт., тележки малые 2 шт., инвентарный номер 04214215 | 9 270,00 | 927,00 |
| 8 | Котел водогрейный стальной КСВ-0,09Т, 2004 г. в., зав. № 1363, инвентарный номер 1060 | 3 150,00 | 315,00 |
| 9 | Станция штукатурная СШ-6, инвентарный номер 42129 | 2 700,00 | 270,00 |

*Начальная цена снижена на 10 %.*

**Объекты расположены по адресу: Минская область, г. Вилейка, ул. Чапаева, 50.**

Шаг аукциона – 5 (пять) процентов.

**Задатки (10 % от начальной цены) перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».** Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 30 (тридцати) календарных дней со дня проведения аукциона, если иной срок не будет установлен собранием (комитетом) кредиторов.

**Победитель аукциона (единственный участник аукциона) в течение 5 (пяти) банковских дней со дня проведения аукциона оплачивает вознаграждение, в размере 10 % от цены продажи предмета аукциона и возмещает затраты на публикацию.**

Условия аукциона:

- имущество приобретается на условиях 100 % предоплаты и оплаты Покупателем (единственным участником) аукциона комиссионного вознаграждения банку за проведения данного платежа;
- Покупатель обязан за свой счет принять приобретаемое имущество, в том числе осуществление вывоза, хранения, погрузочно-разгрузочных работ;
- на Покупателя возлагается обязанность по переоформлению (в ГАИ, военкомате), снятию и постановке на учет приобретаемого имущества за свой счет.

Лица, желающие участвовать в торгах, обязаны подать организатору торгов, в указанный в извещении о проведении торгов срок, заявление на участие в торгах с приложением следующих документов:

- заверенного банком документа, подтверждающего внесение суммы задатка на текущий (расчетный) банковский счет, указанный в извещении о проведении торгов;
- для индивидуального предпринимателя – копии свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя (без нотариального засвидетельствования);
- для юридического лица – доверенности, выданной представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), а также копии свидетельства о государственной регистрации юридического лица (без нотариального засвидетельствования);
- для иностранного юридического лица, иностранной организации, не являющейся юридическим лицом, созданной в соответствии с законодательством иностранных государств иностранным государством и его административно-территориальными единицами в лице уполномоченных органов, международной организации – легализованных в установленном порядке копий учредительных документов, выписки из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иного эквивалентного доказательства статуса юридического лица в соответствии с законодательством страны происхождения, документа о финансовой состоятельности, выданного обслуживающим банком (без нотариального засвидетельствования);
- для представителя гражданина Республики Беларусь, в том числе индивидуального предпринимателя, – доверенности, оформленной в соответствии с законодательством.

При подаче документов на участие в торгах граждане Республики Беларусь, иностранные граждане и лица без гражданства, а также граждане Республики Беларусь, постоянно проживающие за пределами Республики Беларусь, в том числе представители юридических лиц Республики Беларусь, предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

Победителем признается участник торгов, предложивший наиболее высокую цену приобретения лота по сравнению с предложениями других лиц.

Участникам, не признанным победителями, задаток возвращается в безналичной форме в течение 3 банковских дней с момента утверждения протокола об итогах торгов.

Результаты торгов оглашаются публично в день проведения торгов.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником, предмет торгов продается этому частнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Организатор аукциона вправе отказаться от их проведения не позднее чем за пять дней до даты их проведения.

Порядок проведения торгов и оформление участия в торгах определяется условиями о проведении торгов ознакомиться с которым можно в дни приема заявлений на участие в торгах, а также на сайте организатора торгов **www.rlt.by**. Предыдущее извещение было опубликовано в газете «Звязда» от 15.10.2021.

Аукцион состоится **05.01.2022 в 14.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324.** Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **04.01.2022** до **16.00** по указанному адресу.

**Тел.: (8017) 516-8065, 516-80-64, (8029) 102-21-17.**

УНП 690018995

## ООО «Деловая оценка» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Табаквинторг» (продавец) извещает о проведении 27 декабря 2021 года открытого повторного аукциона по продаже имущества в 10.00 по адресу: Гомельская обл., г. Гомель, ул. Жарковского, д. 24, каб. 3-2

| |
|---|
| **ЛОТ № 1:** изолированное помещение с инвентарным номером 300/D-678 площадью 960,7 кв. м, назначение – торговое помещение, наименование – торговое помещение |
| **Адрес:** Гомельская обл., г. Гомель, ул. Привокзальная, 2 А-109 |
| **Информация о земельном участке:** кадастровый номер 340100000001000921, площадь 0,1871 га (доля в праве 37/250); назначение – земельный участок для эксплуатации и обслуживания многоквартирных жилых домов, встроенных изолированных помещений, не относящихся к жилищному фонду |
| **Начальная цена продажи с учетом НДС: 1 533 700,00** бел. рублей |
| **Задаток (3 %) с учетом НДС: 46 011,00** бел. рублей |
| **Дополнительные условия:** заключены договора аренды: РУП «Фармация» действует до 24.09.2024 г.; ОАО «Белинвест Банк» – до 01.10.2022 г.; ООО «Городская сеть терминалов» – до 11.11.21 г.; ООО «Тимоша бел» – до 11.04.22 г.; ИП Мишанина М.Н. – до 31.12.2021 г. |

**Продавец: ОАО «Табаквинторг»**, г. Гомель, ул. Могилевская, 1а.

Контактный телефон +375 29 334-04-60; +375 44 599-02-90.

**Шаг аукциона – 5 % от предыдущей названной аукционистом цены продажи предмета аукциона.**

**Для участия в аукционе необходимо:** 1. Оплатить задаток на расчетный счет **Продавца ОАО «Табаквинторг»: р/с BY44PJCB30124055581000000933 ОАО «Приорбанк» (г. Гомель, ул. Красноармейская, 3а), БИК PJCBBY2X, УНП 400078357.**

**2.** Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов по адресу: г. Гомель, ул. Жарковского, д. 24, каб. 3-2, в рабочие дни с **10.00 до 13.00** и **14.00 до 17.00** от даты опубликования настоящего извещения. **Прием заявлений заканчивается 24.12.2021 г. в 16.00.**

**Для участия в аукционе предоставляются:** документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков) на текущий (расчетный) банковский счет, указанный в извещении, с отметкой банка; юр. лицом или индивидуальным предпринимателем (далее – ИП) Республики Беларусь – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию этого юр. лица или ИП; иностранным юр. лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство юр. статуса в соответствии с законодательством страны учреждения с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; иностранным ИП – легализованный в установленном порядке документ, подтверждающий статус, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; представителем юр. лица Республики Беларусь – доверенность; представителем гражданина или ИП Республики Беларусь – нотариально удостоверенная доверенность; представителем иностранного юр. лица, иностранного физ. лица или ИП – доверенность, легализованная в установленном законодательством порядке, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык. При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юр. лица – также документ, подтверждающий его полномочия.

**Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за 3 (три) дня до его проведения.** В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, объект аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на **5 (пять) %.** Победителем торгов будет признан участник, предложивший более высокую цену. Лицо, являющееся победителем торгов, обязано: подписать протокол о результатах аукциона; заключить договор купли-продажи в течение **10 (десяти)** календарных дней с момента подписания протокола; расчеты производить в следующем порядке: четырьмя равными долями каждые **10 (десять)** календарных дней со дня заключения договора купли-продажи; возместить затраты на организацию и проведение аукциона и оплатить вознаграждение организатору торгов в размере 1,0 % в течение **5 (пяти) рабочих дней** с момента подписания протокола. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет окончательной стоимости предмета оценки. Проводится аукцион в соответствии с Положением Общества с ограниченной ответственностью «Деловая оценка» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части).

**Дополнительная информация по контактным телефонам организатора аукциона: +375 (232) 34-62-36, +375 (44) 750-40-03, +375 (29) 303-30-62 и на сайте www.deloocenka.by**

## ООО «Деловая оценка» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Борисовский завод полимерной тары «Полимиз» (продавец) извещает о проведении 27 декабря 2021 года открытого повторного аукциона по продаже имущества в 11.00 по адресу: Гомельская обл., г. Гомель, ул. Жарковского, д. 24, каб. 3-2

| № лота | Наименование имущества | Начальная цена продажи с НДС, бел. руб. | Задаток (10 %) с НДС, бел. руб. |
|---|---|---|---|
